Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 8 1933 г.
№ 52 (4596)
Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА НЯЧУВАНЫ ФАШЫСЦКІ ТЭРОР, 4.800 ТЫС. ПРАЛЕТАРАЎ ГАЛАСАВАЛА ЗА КАМПАРТЫЮ

КАМПАРТЫЯ ЗАВАЯВАЛА 312.000 НОВЫХ ГАЛАСОЎ ПРЫ ВЫБАРАХ У ПРУСКІ ЛЯНДТАГ

Сіла германскай рабочай клясы ня зломлена--лобавая атака фашызму адбіта

Германскі пралетарыят застаўся верным да канца свайму рэвалюцыйнаму сьцягу-сьцягу гераічнай кампартыі Германіі

Вялізарная палітычная перамога германскай кампартыі

4.800 тыс. рэвалюцыйных германскіх пралетараў, якія галасавалі за кампартыю, далі належны адказ фашысцкай дыктатуры.

Нацыянал-сацыялісты гавораць, што яны перамаглі на выбарах. Яны цьвердзяць, што «5-га сакавіка нацыя выказалася за іх». У тым якраз і заключаецца найгыбейшае зьлачэньне вынику германскіх выбараў гэтага году, што, ня гледзячы на нязвычайна разбухлы лік галасоў, паданых за нацыянал-сацыялістаў, германскі пралетарыят застаўся верны да канца свайму рэвалюцыйнаму сьцягу, сьцягу гераічнай германскай кампартыі.

Германскі фашызм прыплыў да выбарчых вынікаў на патоку правакацый. Яшчэ за месяц да выбараў $^{2}/_{3}$ камуністычных газэт былі забаронены, па ўсёй краіне пракацілася першыя хвалі масавых арыштаў, памяшканьні цэнтральных і абласных устаноў партыі былі разгромлены. Тэрор дасягнуў свайго апагею пасьля правакацыйнага падпалу рэйхстагу. **Увесь буржуазны друк, якога ніяк не западозрыш у спачуваньні германскай кампартыі, на падставе неабвержных фактаў прышоў да вываду, што Ван-дэр-Любэ — нацыянал-сацыяліст, што падпал рэйхстагу — справа рук фашысцкіх правакатараў, якія падрыхтоўвалі выбары і разгром кампартыі.**

Да дня выбараў у Германіі не засталося ні адной легальнай рабочай газэты. Агітацыйныя матар'ялы былі канфіскаваны, мітынгі і дэманстрацыі забаронены. Агітацыя за сьпіс кампартыі цягнула за сабой неадкладны арышт, а то і сьмерць. Гаргулаўцы ўстойваюць колькасьць ахвяр фашысцкага тэрору за гэтыя дні. Паводле падлікаў «Таймс», 1 студзеня гэтага году фашыстамі забіта 95 рабочых. Колькі забіта на самой справе — ніхто ня ведае, таксама як лічба невядома аб колькасьці параненых. 6.000 рэвалюцыйных рабочых кінуты ў турмы на працягу апошніх 7-8 дзён. Гэта афіцыяльныя даныя, фактычна лік арыштаваных значна вышэйшы і даходзіць да 10.000. У засьценках буржуазіі пакутуюць тысячы лепшых сытоў германскага пралетарыяту. У турму кінут правадыр кампартыі і германскага пралетарыяту — гамбургскі гарбар тав. Эрнст Тэльман.

Партыя германскіх гаргулаўцаў даказала, што няма такой подласьці, на якую ня былі б здольны пануючыя клясы ў іх барацьбе супроць рэвалюцыйнага пролетарыяту. Германскія чорнасоценцы не выпадкова стараліся: яны ўсімі сіламі імкнуліся ўпушыць усёй міжнароднай рэакцыі, што ў асобе германскага фашызму яны набываюць вышкаленых катаў, адданых туромшчыкаў, паслухмяных жандараў. Іменна гэтым, між іншым, тлумачыцца **антысавецкая** кампанія чорнасоценнага друку на сьчалу лідэраў нацыянал-сацыялістаў — гэтых шутоў на троне. Бессаромнасьць інсінуатараў даходзіла да таго, што сваіх правакатараў — Ван-дэр-Гаргулавых яны пазграбна прабавалі выдаваць за агентаў Масквы.

Германскі фашызм мабілізаваў усе свае сілы, каб лобавай атакай разграміць порадавы атрад эўрапейскай рабочай клясы — германскі пралетарыят. **Гэта лобавая атака фашызму адбіта.**

У гэтым заключаецца галоўны палітычны вынік выбараў 5 сакавіка.

Выбары показалі, якія найгыбейшыя карэньні пусьціла германская кампартыя ў найшырэйшыя тоўшчы працоўных мас. Пасьлядоўная прэсы і легальных магчымасьцяй агітацыі, пастаўленая на сутыкненьні з законам, германская кампартыя, тысячэмі ніцей вывязаная з пралетарыятам і працоўнымі масамі, яшчэ вышэй узьняла ў дні фашысцкай разьюшанасьці сьцяг камунізму.

Вялікі выбарчай барацьбы, у якой усе перавагі былі выключна на баку клясавых ворагаў пралетарыяту, на баку рэакцыі, сьведчаць, — аб гэтым гавораць і лічбовыя даныя, што германская кампартыя адбіла атаку партыі гаргулаўцаў і ўтрымала за сабой усе пазыцыі, якія яна завалявала на працягу апошніх год.

Адну «трэць нямецкага народу» фашызм асудзіў на мучэньне. Другую ён шкабаваў запалохаць. Трэцюю — падкупіць. Якраз напярэдадні выбараў фашысцкая дыктатура з нячуванай помпай паведаміла аб «вялікай міласьці», якая будзе аказана «нямецкаму народу»: 40.000 цэнтнераў масла і 700.000 цэнтнераў жыта будуць разьмеркаваны сярод «вернападданых трэцяй імпэрыі». Як тапер германскі фашызм хацеў купіць мільёны душ германскіх працоўных! Як ня ўспомніць пры гэтым выгадку стыль Люі Бонапарта. Грубы фарс «вялікай міласьці», цалкам адпавядае ўсяму стылю фашысцкай дыктатуры.

І ўсё-ж нацыянал-сацыялісты не дасягнулі сваёй мэты: у іх няма тэй большасьці, аб якой яны марылі. Ім не ўдалося выбіць кампартыю з яе пазыцый у асноўных прамысловых цэнтрах, ня гледзячы на тое, што ў ход былі пушчаны ўсе сродкі. Павялічэньне ліку галасоў, паданых за нацыянал-сацыялістаў, толькі часткова тлумачыцца ўзросшым лікам удзельнікаў галасаваньня 5-га сакавіка. Не малую ролю адыгралі ўсе формы прымусу, рознастайныя падробкі і фальсыфікацыі, аб якіх гавораць сусьветны друк ужо ў першых водгуках з поваду вынікаў выбараў.

У гэтых умовах зьмяншэньне ліку галасоў, паданых за кампартыю, не показальна. Насуменна, што частка рабочых ня прымала ўдзелу зусім ў галасаваньні з-за фашысцкага тэрору. Нясумненна таксама, што частка галасоў, паданых за кампартыю, была прызнана несапраўднай.

У гэтых умовах вялізарнае значэньне набывае **павялічэньне** ліку галасоў, паданых за кампартыю пры выбарах у **прускі** ляндтаг.

На гэтым рашаючым фронце кампартыя выйграла 312.000 новых галасоў, 312.000 новых байцоў, праверэных у дні жорсткай барацьбы. Гэты факт — заваяваньне новых 312.000 галасоў — па сваім палітычным значэньні перавышае больш значнае павялічэньне галасоў на мінулых выбарах. Трэба сабе ўявіць абстаноўку, у якой выбары працякалі, каб ацаніць **вялізарную палітычную перамогу, атрыманую кампартыяй.**

Выбары 5-га сакавіка адкрываюць новую эпоху клясавай барацьбы германскага пралетарыяту. Ва ўмовах невымерна горшых і цяжэйшых, чым калі-небудзь, ва ўмовах, калі нават бісмаркаўскі «выключны закон супроць сацыялістаў» пакінут далёка ззаду, германская кампартыя падняла ў барацьбе з фашызмам мільённыя масы. Несакрушальнай окапай сярод бушуючага мора рэакцыі стаіць перадавы пматмільённы атрад германскай рабочай клясы, які ўзначальваецца гераічнай кампартыяй Германіі.

Няхай шалее рэакцыя! Германскі фашызм, нахватаўшы пры дапамозе тэрору і правакацый мільёны галасоў і прэтэндуючы на падставе гэтага на тое, каб «прадстаўляць нацыю», выпаў з выбарчай барацьбы абцяжараным яшчэ большымі супярэчнасьцямі, чым да выбараў. Нацыянал-сацыялісты ўжо зараз, на другі дзень пасьля выбараў, сутыкаюцца твар да твару з другім атрадам фашызму — «чорна-бела-чырвоным сьцягам». Асноўная супярэчнасьць, якая разьдзірае цяперашні ўрад, — барацьба паміж аграрным і фінансавым капіталам, — ня знята. Іменна зараз яна дасьць сябе адчуць з найбольшай сілай.

Германскі капіталізм правёў «румынскія» выбары якраз у той дзень, калі ў ПАЗШ адбылася выключная па сваіх разьмерах, па сіле і вынікам для ўсяго капіталістычнага сьвету фінансавая катастрофа. Крах даляра, грукат эканамічных абвалаў — вось якой музыкай суправаджаецца «пераможны марш» германскай рэакцыі. Што можа сказаць у гэтых умовах германскі фашызм? Вуснамі свайго правадыра ён залуляе 4 сакавіка ў Кенігсбэргу: «Нас пытаюць, дзе ваша праграма. Мы па гэта даем ясны адказ: вы пачалі хлусьнёй, а мы пачнем з праўды». Гэта выключная па сваім зьмесьце «праграма», якая выкрывае ўбоства фашызму і безымястоўнасьць яго дэмагогіі, разам з тым сьведчыць і аб другім: германскай рэакцыі няма чаго сказаць галодным масам. У яе няма і ня можа быць праграмы барацьбы з крызісам. Турмамі, сьвінцом — не накорміш галодных.

Вузел супярэчнасьцяй германскага капіталізму як унутраных, так і міжнародных, сьцягваецца ўсё тужэй. Сваёй палітыкай фашысты робяць усё, каб гэтыя супярэчнасьці яшчэ больш абвастрыць.

У Германіі няма другой клясы, апрача пралетарыяту, якая магла-б вывесьці краіну з голаду і галечы і разарваць ланцугі, накладзеныя на працоўных у рэзультаце злачынай імпэрыялістычнай вайны.

Гэтай клясе і яго кампартыі належыць апошнее слова ў клясавых баёх, якія разгортваюцца. (Скарочаная перадавая «Праўды», перададная па радыё).

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ У ГЕРМАНСКІ РЭЙХСТАГ

БЭРЛІН, 6. Агенцтва «Вольфа» паведамляе: з агульнай колькасьці паданых пры выбарах у рэйхстаг 39.289.854 галасоў атрымалі:

НАЦЫЯНАЛ - САЦЫЯЛІСТЫ — 17.264.328 галасоў;

ЧОРНА - БЕЛА - ЧЫРВОНЫ БЛЕК (нацыяналісты) — **3.131.336** галасоў;

ПАРТЫЯ ЦЭНТРУ — 4.289.354 галасы;

БАВАРСКАЯ НАРОДНАЯ ПАРТЫЯ — 1.206.293 галасоў;

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ—7.176.226;

КАМПАРТЫЯ — 4.746.034 галасы.

Такім чынам, супроць апошніх выбараў у рэйхстаг, нацыянал-сацыялісты атрымалі каля 6 млн. новых галасоў, чорна-бела-чырвоны блёк выйграў 200 тыс. галасоў і камуністы страцілі каля 1 млн. галасоў. Разам з чорна-бела-чырвоным блёкам нацыянал - сацыялісты сабралі 51,9 проц. усіх галасоў.

Колькасьць мандатаў, атрыманых **НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТАМІ**, складае **288** супроць 195 у лістападзе 1932 году. **ЧОРНА-БЕЛА-ЧЫРВОНЫ БЛЕК — 52** мандаты (52), **ПАРТЫЯ ЦЭНТРУ — 70**(69), **БАВАРСКАЯ НАРОДНАЯ ПАРТЫЯ — 21** (19), **САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ — 118** (121) і **КАМУНІСТЫ — 81** мандат (100).

***

БЭРЛІН, 6. Агенцтва «Вольфа» паведамляе, што паводле папраўковых даных на выбарах у прускі ляндтаг нацыянал - сацыялісты атрымалі 43 проц. і чорна-бела-чырвоны блёк атрымаў 9 проц. агульнай колькасьці галасоў.

729 тысяч працоўных Бэрліну галасавала за камуністаў

БЭРЛІН, 6. На выбарах у рэйхстаг па Бэрліну камуністы атрымалі 729 тысяч галасоў (6 лістапада 1932 г. было 816 тысяч галасоў), нацыянал-сацыялісты — 1 млн. галасоў (720 тысяч), сацыял - дэмакраты — 647 тыс. галасоў (646 тыс.), дзяржаўная партыя — 52 тысяч галасоў (39 тысяч); партыя цэнтру — 148 тысяч галасоў (123 тыс.); чорна-бела-чырвоны фронт (нацыяналісты і «сталёвы шлем») — 326 тыс. галасоў (314 тысяч); народная партыя 26 тысяч галасоў (30 тысяч), хрысьціянскія сацыялісты — 14 тысяч галасоў.

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ У ПРУСКІ ЛЯНДТАГ

Камуністы атрымалі 3.131.471 галасоў

БЭРЛІН, 6. Паводле даных агенцтва «Вольфа», папяровыя вынікі выбараў у прускі ляндтаг, якія адбыліся ўчора, прадстаўляюцца ў наступным выглядзе:

Усяго ў галасаваньні прымала ўдзел **24.008.073** выбаршчыка супроць **22.192.987** у часе апошніх выбараў (24 красавіка 1932 г.).

Паданыя галасы разьмяркоўваюцца наступным чынам:

НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТЫ атрымалі **10.332.670** галасоў супроць 8.007.384, або 43 проц. супроць 36,3 проц.;

САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ — 3.952.404 супроць **4.675.173**, або 16,5 проц. супроць 21,2 проц.;

КАМУНІСТЫ атрымалі 3.131.471 супроць **2.819.763**, або 12 проц. супроць 12,8 проц.;

ПАРТЫЯ ЦЭНТРУ — 3.367.379 супроць **3.371.932**, або 14 проц. супроць 15,3 проц.;

ЧОРНА-БЕЛА-ЧЫРВОНЫ БЛЕК (нацыяналісты) — **2.158.400** супроць **1.524.230** (без «Сталёвага шлему» і інш.), або 9 проц. супроць 6,9 проц.;

НАРОДНАЯ ПАРТЫЯ — 241.687 супроць **330.745**, або 1 проц. супроць 1,5 проц.;

ХРЫСЬЦІЯНСКА-САЦЫЯЛЬНАЯ ПАРТЫЯ—215.047 супроць **255.177**, або 1 проц. супроць 1,2 проц.;

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАРТЫЯ — 164.166, або 0,7 проц.;

астатнія дробныя групы і несапраўдныя галасы — 444.900, або 1,8 проц.

ШАЛЁНЫ РАЗГУЛ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ Ў ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ

Кулямёты і бранявікі на вуліцах гарадоў Германіі

БЭРЛІН, 6. Фашысцкі тэрор у дзень выбараў дасягнуў свайго апагею. Бэрлін напоўнен паліцыяй і штурмавікамі, якія разгульваюць з рэвальвэрамі і дубінкамі і разьязджаюць на аўтамабілях. Было сурова забаронена вывешваньне антыфашысцкіх сьцягаў і транспарантаў, ня кажучы ўжо аб камуністычных. Як толькі актывісты кампартыі зьявіліся ў выбарчых пунктах нясучы плякаты з заклікам: **«Галасуйце за камуністаў, сьпіс № 3»**, зараз-жа наступіў арышты, плякаты канфіскаваліся і тут-жа зьнішчаліся. Штурмавікі разам з паліцыяй страна сачылі за вокнамі дамоў.

Паводле далёка ня поўных даных, **па ўсёй краіне арыштавана каля 4 тыс. чалавек, у большасьці камуністаў.** Усю ноч напярэдадні выбараў адбываліся вобыскі і арышты. **У Бэрліне** зноў арыштавана 126 чал., **у Рэйнскай вобласьці** — 40, **у Кенінгсбэргу** — 91, у рабочых цэнтрах **Вупэртале, Вельбэрце, Лянгебэргу і Мэвідысе** — 400 чал., **у Брэмене** — 40, **у Эрфурце** — 90 і г. д.

У некалькіх гарадох адбыліся **крывавыя сутычкі.** Асабліва сур'ёзная сутычка адбылася **ў Брэслаўлі.** «Нах аусгабе» зьмясьціла паведамленьне аб гэтым пад загалоўкам — **«Вулічны бой у Брэслаўлі».** Паміж калёнай штурмавікоў і паліцыяй, з аднаго боку, і рабочым насельніцтвам — з другога, адбылася перастрэлка. **Паліцыя пусьціла ў рух кулямёты і бранявік.** Газэта паведамляе, што адзін штурмавік забіт, адзін цяжка паранен і некалькі лёгка паранены. Газэта ня прыводзіць ніякіх даных аб колькасьці ахвяр з боку рабочага насельніцтва.

Сутычкі адбыліся таксама ў **Вормсе**, дзе адзін штурмавік паранен; у **Оберанштаце**, дзе цяжка паранен рабочы, у **Оксгаузене і Грызгейне**, дзе паранены адзін штурмавік і адзін рабочы камуніст.

Бакханалія тэрору разгорваецца па простых указаньнях Герынга, які заявіў у Франкфурце-на-Майне ў сваёй прамове: **«Мая справа — не навялізіць справядлівасьці, а толькі зьнішчаць і выкараняць».** Зусім у стылі мікалаеўскіх дзяржыморадаў **«Цягнуць, ня пушчаць!» «Патронаў не шкадаваць!»**

Вечарам адбыўся парад саюзу «Сталёвы шлем» з удзелам 26 батальёнаў. Гвардыя манархічнай рэакцыі маршыравала ў поўным паходным рыштунку. Старшыня саюзу **Дзюстэрбэрг** выступіў з прамовай, у якой патрабаваў прадстаўленьня дзяржаўных чыноўніцкіх пасад у першую чаргу старым франтавікам, а толькі потым моладзі. Іншымі словамі, лідэры «Сталёвага шлему» патрабуюць узмацненьня дзяржаўнага апарату сваімі прыхільнікамі-манархістамі ў процівагу **Гітлеру**, які мае намер пасадзіць усюды нацыянал-сацыялістаў.

Сьцяпутыя ў **Бэрліне** члены «Сталёвага шлему» перавезены на казарменнае становішча і прывезены ў баявую гатоўнасьць. **Як перадаюць, гэта мера выклікана небясьпекай путчу, які рыхтуе Гітлер з мэтай адхіліць германскіх нацыяналістаў ад улады і стаць манапольным гаспадаром становішча.**

Па паведамленьні **«Бэрлінэр фольксцайтунг»** і іншых газэт, урад мае намер склікаць рэйхстаг у самы бліжэйшы час — **не пазьней 20 сакавіка. Рэйхстагу будзе прапанавана: прыняць закон, які дае ўраду надзвычайныя паўнамоцтвы, спыняючыя дзеяньні канстытуцыі, і распусьціць рэйхстаг на доўгі тэрмін.**

12 САКАВІКА—ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б

ДВАНАЦЦАТАГА САКАВІКА, А 7-Й ГАДЗ. УВЕЧАРЫ СКЛІКАЕЦЦА ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б РАЗАМ З ПЛЕНУМАМ МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б, ЦЭНТРАЛЬНЫМ І МЕНСКІМ ГАРАДЗКІМ ПАРТАКТЫВАМ І САКРАТАРАМІ РАЙКОМАЎ КП(б)Б.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) АД 2-ІІ 1933 г. (ДАКЛАДЧ. ТАВ. ГІКАЛО).
2. АБ ХОДЗЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ (ДАКЛ. Т. Т. ГАЛАДЗЕД, ШАРАНГОВІЧ).
3. БЯГУЧЫЯ ПЫТАНЬНІ.

ЦК КП(б)Б.

Тэльман выбран у рэйхстаг

БЭРЛІН, 6. Па кандыдацкім сьпісе кампартыі ў рэйхстаг выбраны ТЭЛЬМАН, ТОГЛЕР, МЮНЦЭНБЭРГ і іншыя; па сьпісе ў ляндтаг выбраны ПІК, КЭНЭН, КАСПЭР, ШВЭН і рад іншых.

Не дапамог і падпал рэйхстагу

ЛЕНДАН, 6. Нават найбольш кансерватыўныя органы ангельскага друку ўпарэчна адзываюцца аб мэтадах, з дапамогай якіх гітлераўцы імкнуліся, але без належнага посьпеху, атрымаць большасьць на выбарах. **Атрымаць самастойную большасьць ім так і не ўдалося.** Не дапамог і падпал рэйхстагу, хоць, як указвае «Дэйлі Тэлеграф», «значная частка германскіх выбаршчыкаў бязумоўна галасавала сёньня ва ўпэўненасьці, што фашысты адкрылі новую эпоху супроць Германіі». Карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф» напамінае, што «камуністычныя пляны», якімі Герынг палохаў па радыё выбаршчыкаў, зьяўляліся простым пераказам аднэй брашуры, апублікаванай у 1931 годзе ў **Цюрыху.** Фашысцкае паведамленьне аб тым, што нібы камуністычны дэпутат **Шуман** заявіў на адным перадвыбарчым мітынгу «праз гадзіну згарыць рэйхстаг», аказалася цэлае «памылковым». Паліцэйскі, які паведаміў аб гэтым уладам, «памыліўся» на некалькі гадзін.

„Тэрарыстычныя выбары Гітлера"

ВЕНА, 6. Большая частка раніцішніх аўстрыйскіх газэт публікуе паведамленьне аб рэзультатах выбараў у Германіі пад загалоўкам: «Тэрарыстычныя выбары Гітлера». «Вінэр Монтагцэйтунг» піша: «Выбары натуральна не даюць ніякага адлюстраваньня сапраўдных настрояў германскага народу. Яны зьяўляюцца толькі рэзультатам тэрору голай сілы і шалёнага душэньня свабоды мысьлі».

Камуністычная «Ротэ Фанэ» піша: **«Сіла германскай рабочай клясы ня зломлена.** У Германіі надыходзіць вялізарныя баі, якія зьніштчаць фашысцкую дыктатуру, калі толькі рабочыя ўсюды створаць адзіны пралетарскі фронт барацьбы».

6 забойстваў у дзень

ЛЕНДАН, 6. Красамоўныя даныя аб перавыбарчым тэроры нацыянал-сацыялістаў падае бэрлінскі карэспандэнт **«Таймс».** Па яго паведамленьні за апошнія два дні перад выбарамі 3 і 4 сакавіка паступілі весткі аб 12 палітычных забойствах. Большасьць забітых — **камуністычныя рабочыя.** У першыя 63 дні 1933 году прыходзілася ў сярэднім **па два забойствы ў дзень,** у апошнія два дні **па 6 забойстваў.** Усяго з студзеня забіта 127 чал., з якіх 95 камуністаў, сацыял-дэмакратаў і беспартыйных, 28 нацыянал-сацыялістаў, 4 паліцэйскіх.

«Ёсьць падставы думаць, што лічбы, якія адносяцца да апошніх дзён, значна зьменшаны, бо камуністычная і сацыялістычная прэса задушана — гаворыць карэспандэнт — а таму сапраўдную колькасьць забойстваў устанавіць немагчыма».

Штурмавікі расстрэльваюць арыштаваных камуністаў

БЭРЛІН, 6. Агенцтва «Вольфа» папярае наступныя весткі. «Як паведамляе паліцыя, у панядзелак раніцой а 6 гадзіне **былі расстраляны арыштаваныя камуністычныя кіраўнікі Дз-Лёнжвіль і Клясэн пры спробе ўцячы на двор гімназіі ў Обэргаўзэне.** Гугенбэрская **«Лёкаль Анцэйгер»** піша, што камуністы **Дз-Лёнжвіль і Клясэн былі гэтымі днямі арыштаваны ў ліку іншых 400 чал. і былі ізаляваны ў будынку рэальнай гімназіі ў Обэргаўзэне.** А 6 гадзіне раніцы яны былі выведзены на двор. Як відаць, яны паранены, піша газэта, што гэты момант зьяўляецца найбольш адпаведным для ўцяканьня. У момант, калі ім здавалася, што за імі ня сочаць, яны прабавалі драбрацца на вуліцу. Нібы пасьля беспасьпяховай спробы затрымаць, у іх некалькі раз стрэлілі. **Дз-Лёнжвіль быў забіт стрэлам у грудзі, Клясэн стрэлам у галаву.** Газэты падаюць далей, што за імі наглядалі і стралялі члены дапаможнай паліцыі, якая складаецца з членаў нацыянал-сацыялістскіх штурмавых атрадаў і сталёвага шлему.

„Посьпехі нацыянал-сацыялістаў дасягнуты з прычыны выключнага тэрору супроць камуністаў"

Заява цэнтральнага органу гітлераўцаў

БЭРЛІН, 6. Урадавы і блізкі да яго друк выказваюць задаваленьне з прычыны таго, што абедзьвюм урадавым партыям удалося сабраць абсалютную большасьць, аднак, побач з гэтым, у гэтым-жа друку, ужо сёньня ёсьць намёкі на няўхільнасьць супярэчнасьцяй унутры ўрадавага лягеру, у сувязі з суадносінамі сіл паміж урадавымі партыямі, якія зьявіліся на карысьць нацыянал-сацыялістаў.

Гэты другі момант прызнае, у прыватнасьці, **«Цвэльф Ур Блят».** Аналізуючы вынікі ўчарашніх выбараў, «Цвэльф Ур Блят» падкрэсьлівае, што перамога нацыянал-сацыялістаў **гусім ня сьведчыць аб тым, што ім удалося зламаць фронт кампартыі і сацыял-дэмакратыі.** Трэба сказаць, — піша газэта, — што з прычыны праведзенага, якім падпадае кампартыя, значная колькасьць яе прыхільнікаў не пайшла да выбарчай урны. Апрача таго, частка прыхільнікаў кампартыі галасавала за сацыял-дэмакратаў, бачачыся, што ў праціўным выпадку галасы прападуць, бо ў камуністаў ня ма ніякіх шансаў на тое, што іх кандыдаты ўдасца зьявіцца ў рэйхстагу.

«Дойтэ Альгемэйне Цэйтунг» піша, што вынікі выбараў поўны бязмежных магчымасьцяй. Газэта выказвае надзею, што Гітлер, «апіраючыся на парады людзей, з якімі ён за 30 стуценей заключыў сваю нацыянальную канцэнтрацыю, разам з прэзыдэнтам Гіндэнбургам вывяліць Германію ад усіх небясьпек, якія ён сам маляваў у такіх цёмных фарбах».

«Ангрыф» адкрыта прызнае, што посьпехі нацыяналістаў дасягнуты **у рэзультаце выключных рэпрэсій супроць камуністаў.** Пры гэтым **«Ангрыф»** падкрэсьлівае, што **ў тых абласьцях, дзе нацыянал - сацыялісты атрымалі дзяржаўным апаратам, колькасьць галасоў, паданых за марксістаў, вымянушалася.**

Новая хваля арыштаў і вобыскаў у Германіі

БЭРЛІН, 6. Учора ўдзень у паўночнай частцы Бэрліну, паліцыя зрабіла вобыскі ў памяшканьнях ряду сяхцый саюзу пралетарскіх бязбожнікаў у Комбленцы. Пасьля праведзеных вобыскаў у радзе раёнаў гораду арыштавана 80 работнікаў кампартыі. У Мюнхэне арыштавана 7 чал. па абвінавачаньні «ў распаўсюджаньні рэвалюцыйнай літаратуры і ў падрыхтоўцы да дзяржаўнай здрады». За апошнія тры дні ў Мюнхэне зроблена, згодна паведамленьня агенцтва «Вольфа», некалькі сотень вобыскаў у «палітычна падазроных асоб», арыштавана 58 чал. за распаўсюджаньне лістовак, расклейваньне камуністычных плякатаў, лёзунгаў і г. д.

У Цывэрыху арыштован рад камуністаў, якім паліцыя прад'яўляе абвінавачаньне ў «падпале двара пратэстанцкага папа і мясцовага замку».

У Дрэздэне арыштавана 16 сацыял-дэмакратаў, у якіх нібыта былі знойдзена розная зброя.

У Бэрліне забаронена на тры месяцы часопіс дзяржаўнай партыі «Дойтэр Аўфбау».

Паводле паведамленьняў газэт, на шапкі памяж Прынцэрфам і Дорынгдорфам кола Бунцлау (Прусія) у мінулую ноч было перарэзана некалькі тэлеграфных правадоў, якія злучаюць Брэслаў з Бэрлінам і вялі таксама да мясцовасьці Нейгамэр, дзе звычайна праводзяцца вайсковыя запяткі. Арыштавана некалькі чалавек, якія па водле паліцэйскага паведамленьня «належаць да левых радыкальных колаў».

АДОЗВА ІІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ

ПАРЫЖ, 5. **«Пэпюлер»** друкуе адозву ІІ Інтэрнацыяналу, у якой указваецца, што калі рабочыя будуць разьбіты германскімі фашыстамі, дык рэакцыйныя элементы ва ўсіх краінах пачнуць наступленьне на сацыяльныя дасягненьні рабочай клясы.

Адозва заклікае рабочых усяго сьвету аказаць максымальнае падтрыманьне германскім рабочым.

У адозьве гаворыцца: «З прычыны пагражаючых небясьпек мы заклікаем германскіх рабочых і рабочых усіх краін аднініць узаемныя напады і аб'ядкацца ў барацьбе супроць фашызму. **Сацыялістычны інтэрнацыянал гатоў весьці перагаворы з Камінтэрнам з мэтай агульных выступленьняў, як толькі гэта арганізацыя таксама будзе гатова да гэтага».**

У заключэньне адозва заўляе аб пагрозе вайны на Далёкім Усходзе і пагрозе эўрапейскаму міру, якая выклікаецца дадзенай у Эўропе.

ЗВАРОТ „НЕЗАЛЕЖНІКАЎ" ДА КАМІНТЭРНУ і ІІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ

ЛЕНДАН, 5. Орган незалежнікаў **«Н'ю лідэр»** друкуе зварот нарвэскай рабочай партыі, незалежнай рабочай партыі Англіі і пяці іншых груп «незалежных» сацыялістаў, накіраваны Камінтэрну і ІІ Інтэрнацыяналу, з заклікам неадкладна склікаць канфэрэнцыю Камінтэрну, ІІ Інтэрнацыяналу і «рэвалюцыйных партый, якія не ўваходзяць у гэтыя абодва Інтэрнацыяналы», для распрацоўкі сумеснага плану дзеяньняў у мэтах падтрыманьня прычыненых фашызмам рабочых.

„СЬЦІСНУЦЬ КУЛАКІ ПЕРАД АГІДНАЙ ХВАЛЯЙ ФАШЫЗМУ"

ПАРЫЖ, 6. Асацыяцыя рэвалюцыйных пісьменьнікаў Францыі апублікавала адозву наконт падзей у Германіі. Адозва называецца **«К агню!»** **ВАЙН КУЦЮР'Е заклуляе,** што **ў сучасных германскіх падзеях** вінавацяць французкі імпэрыялізм, які **налажыў на рабочых і на дробны люд Францыі «ярмо версальскага дагавору».**

АНДРЭ ЖЫД піша: «Германія дае жудасны прыклад тэрору, на шлях якога фатальна ўступае краіна, якая шукае ратунку ў нацыянал-стычным шаленстве». «Палітыка нацыяналізму—гаворыць далей Андрэ Жыд—неабходным чынам вядзе да вайны. Тыя, хто хоча прадухіліць яе, павінны будуць урэшце прызнаць, што толькі барацьба клясаў — я хачу сказаць—барацьба кожнай краіны супроць свайго імпэрыялізму—моцна пра духіліць новы канфлікт, які цяпер падрыхтоўваецца».

АНРЫ БАРБЮС далучаецца да пратесту «супроць страшэнных махінацый», супроць праваказацый, лжы і подлаты, якія ўжываюцца па рабочага руху ў Германіі, заклікае **«сьціснуць кулакі перад агіднай хваляй фашызму».**

РАМЭН РАЛЯН піша, што «жарыцевая чума» германскага фашызму перавысіла сваімі крывавымі выступленьнямі і праваказацыямі «чорную чуму», намякаючы на першыя выступленьні італьянскага фашызму. «Мы заклікаем усіх пісьменьнікаў Эўропы і Амэрыкі—піша Рамэн Ралян—па якой-бы партыі яны не належалі, усіх, хто мае пачуцьцё абурэньня пры відзе зьвярэку над элементарнай годнасьцю чалавека і грамадзяніна. Мы заклікаем усіх тых, хто мае пачуцьцё салідарнасьці, якое зьвязвае нас з тымі, хто выступае супроць сьлепчанага з ланцуга тэрарызму рэакцыі. Усіх іх мы заклікаем далучыцца да нас».

ЖАН РЫШАР БЛОШ піша: «Адзінай сапраўднай дапамогай, якую мы можам аказаць цяперашнім і будучым ахвярам тыранії зьяўляецца наша барацьба супроць французкіх пальонніжаў катаў».

Германскія падданыя ў Гішпаніі—супроць Гітлера

ПАРЫЖ, 6. Як паведамляе агенцтва «Гавас» з Гішпаніі, германскія падданыя, якія пражываюць у Барцэлёне, галасавалі на германскім судне, якое спынілася па-за гішпанскімі водамі. Пасьля звароту на бераг яны былі спатканы групай камуністаў з плякатамі «Інтэрнацыяналу» і воклічамі супроць Гітлера. У будынак германскага консульства невядомымі асобамі былі кінуты каменьні.

Забарона саюзу „рэспубліканскага сьцягу"

БЭРЛІН, 6. У Цюрынгіі сёньня ўдзень забаронен **саюз рэспубліканскага сьцягу,** на чале якога, як вядома, знаходзяцца сацыял-дэмакраты. Забаронены таксама арганізацыі так званага «жалезнага фронту» і ўсе іншыя кіруемыя сацыял-дэмакратычнай партыяй арганізацыі, у тым ліку саюз сацыялістычнай рабочай моладзі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Няхай жыве 8 сакавіка—міжнародны камуністычны дзень жанчын!

РАБОТНІЦЫ І ПРАЦОЎНЫЯ ЖАНЧЫНЫ КАПІТАЛІСТЫЧНАГА СЬВЕТУ ПАД БЛЯВЫМІ ШТАНДАРАМІ КАМІНТЭРНУ УМАЦОЎВАЮЦЬ РАДЫ АДЗІНАГА ФРОНТУ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ ДЛЯ РАШУЧАЙ САМААДДАНАЙ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ НАСТУПЛЕНЬНЯ КАПІТАЛУ, СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАЙ РЭАКЦЫІ І ТЭРОРУ, ЗА ПЕРАМОГУ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Н. Крупская

Жанчына на фронце сацыялістычнага будаўніцтва

У кастрычніку 1932 году мы сьвяткавалі 15-годзьдзе існаваньня савецкай улады і падвялі вынікі нашых дасягненьняў за ўсіх франтох, у тым ліку на фронце разьвіцьця жанчын.

Жанчыны, мы ведаем, прымалі ўдзел самы актыўны ў грамадзянскай вайне, многія з іх загінулі ў баёх, многія загартаваліся ў гэтых баёх. Ва актыўны ўдзел у баёх за саветы на франтох грамадзянскай вайны 54 жанчыны ўзнагароджаны вышэйшай ваеннай узнагародай — ордэнам Чырвонага Сьцягу. Узнагароджаны такім ордэнам т. т. Землячка, Патрыкеева, Сакебава-Баранава, Кусьнецова, Вішнякова, Чумакова і інш. Нямала старых партызанак працуе зараз на выдатных пастох. Жанчыны ўпарта вучыліся грамадзкай работе. Мы ведаем — школай грамадзкай работы зьяўляюцца делегацкія сходы. **За 15 год праз работы дэлегацкіх сходаў прайшло амаль 10 мільёнаў дэлегатак.**

Работніцы і сялянкі сталі больш пісьменнымі. За апошнія чатыры гады мы маем вялікі арух у справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Яшчэ нядаўна больш паловы насельніцтва СССР было няпісьменным і асабліва вялікі быў процант няпісьменных жанчын. Цяпер няпісьменных засталося менш 10 проц. Зараз праведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне, дзяўчынкі ў нас вучацца наровні і сумесна з хлопцамі. У пачатковай школе — чатырохгодцы, дзе навучаньне абавязковае, па СССР вучыцца 19.148.200 дзяцей. Гэтым назаўсёды падрозвацца жаночая няпісьменнасьць. Дзяўчынкі вучацца і ў ШКМ, і ў ФЗС, дзяўчаты ў ФЗВ, тэхнікумах, рабфаках, ВНУ, на ўсякіх курсах. 32 проц. студэнтаў ВНУ — жанчыны. Старая жаночая пэмра адыходзіць у мінулае.

У сельсаветах, РВК, гарсаветах жанчын ад 20 да 25 проц., у складзе членаў ЦВК і УсеЦВК — 186 жанчын. Растуць яны на гэтай рабоце.

Да XV гадавіны Кастрычніка мы маем у тры разы больш жанчын на вытворчасьці, чым гэта было напярэдадні рэвалюцыі. Ня лічачы работы ў калгасах, ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі ўжо ёсьць кала 6 мільёнаў жанчын. Работа на фабрыках, на заводах, па нашых сацыялістычных прадпрыемствах выхоўвае людзей. Сацсаборніцтва і ўдарніцтва захоплівае работніц. Яны не адстаюць ад мужчын. У некаторых месцах, напрыклад, на Урале, па Лысьвенскім заводзе прадукцыйнасьць працы жанчын на 20 проц. перавышае прадукцыйнасьць працы мужчын. У Ленінградзе на «Чырвоным пуцілаўцы» токары адноўкавага разраду, працуючы на адноўкавых варштатах, на адноўкавых дэталях даюць выпрацоўку: мужчыны — 100 проц., жанчыны кала 120 проц. Жанчыны на вытворчасьці стаяць наровні з мужчынамі — яны токары, сьлесары, столяры, зварщыкі і г. д.

Партыя бязупынна дабівалася сыстэматычнага вылучэньня работніц на кіруючую гаспадарчую і савецкую работу. Цэлы рад работніц узнагароджан Ордэнам Леніна і Чырвонага Сьцягу. У адной толькі лёгкай прамысловасьці мы маем 84 жанчыны — дырэктароў і нам. дырэктароў фабрык. Тав. Воранава-Іваноўская, тэкстыльшчыца — нам. наркома лёгкай прамысловасьці СССР.

Вялікую работу праводзяць работніцы па лініі профсаюзаў. Рад жанчын-работніц былі вылучаны старшынямі профсаюзаў: тав. Горава—старшыня ЦК саюзу шоўкава-шарсьцяной прамысловасьці, тав. Аўдзеева—старшыня ЦК саюзу мясасцірапцы, тав. Данілеўская — старшыня ЦК саюзу нархарч, тав. Мотава — старшыня ЦК саюзу хатніх работніц.

Вылучаюцца жанчыны і на кіруючую работу ў саўгасах і калгасах. Тав. Чабагарава — батрачка, партызанка, бязьзьмешны член ЦВК і УсеЦВК з 1924 г., стварыла камуну імя Арцухінай у Спаскай акрузе, была яе старшынёю, дабілася ўзорнай пастаноўкі гаспадаркі, зараз загадвае рабіным зямельным аддзелам; у Ніжня-Волскім краі дырэктарам першамайскага збожжасаўгасу зьяўляецца ткачыха Макарава і г. д. Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат.

І ня толькі на вытворчасьці — на ўсіх франтох працуюць былыя работніцы: у народных судох, у РВК і ЦВК, у галіне аддзелу аховы здароўя, сацыяльнага забесьпячэньня, народнай асьветы, фінансаў. Нарком фінансаў РСФСР — Якаўлева, старая падпольшчыца; нам. наркома аховы здароўя РСФСР — тав. Богат — бацькоўка грамадзянскай вайны, камандзір, скончыла вайсковую акадэмію; намесьнік наркома сацыяльнага забесьпячэньня РСФСР — тав. Лебедзева; загадчыца жаночага сэктару агітпасавага аддзелу ЦК УсеКП(б) — тав. Шабурава, уральская работніца-мэталістка. Асабліва вялікія зрухі бачым мы ў становішчы жанчыны ў нацрэспубліках і нацабласьцях.

Лік жанчын у партыі бязупынна расьце. **У 1922 г. — пры Ільлічы — жанчын камуністак было толькі 40 тыс., да кастрычніка 1932 году іх было ўжо звыш паўмільёна.**

Зьмяняецца і быт. Самай характэрнай лічбай зьяўляецца, бадай, рост ліку дзяцей, ахопленым дашкольным выхаваньнем. У 1922 г. — пры Ільлічы — такіх дзяцей па СССР было кала 50 тысяч, да 15-й гадавіны Кастрычніка — 6.114.500.

Прыведзеныя лічбы і факты паказваюць, якія вялікія дасягненьні ў гэтай галіне. Індустрыялізацыя нашай краіны, калектывізацыя сельскай гаспадаркі стваряюць умовы, спрыяючыя ажыцьцяўленьню наказу Леніна аб поўным разьвіцьці жанчыны. Наказ яго выканаем.

Даб'емся яшчэ большых „посьпехаў у справе выхаваньня жаночых пралетарскіх мас у духу барацьбы за поўную перамогу сацыялізму, у духу выкананьня вялікіх наказаў нашага настаўніка Леніна“ (СТАЛІН).

П. Сазонава

Ахова маці і дзіцяці паводле савецкіх законаў

У результаце першай бальшавіцкай пяцігодкі мы маем вялікае ўцягненьне жанчын за ўсе галіны народнай гаспадаркі. Працоўныя жанчыны СССР ідуць на вытворчасьць, уступаюць у калгасы, каб разам са ўсёй рабочай клясай, пад кіраўніцтвам УсеКП(б), будаваць сацыялістычнае грамадзтва.

Удзельная вага жанчын сярод членаў прафсаюзаў у сярэднім па пралетарыяту павысілася з 25,3 проц. у 1926 годзе да 33,1 проц. у 1932 г., а ў абсалютных лічбах за ўсіх галінах народнай гаспадаркі за 1931-32 г. на 2.500.000 жанчын. Такі вялізарны рост уцягненьня работніц на ўсе галіны прамысловасьці забясьпечваўся арганізацыяй культурна-бытавых установ. Па СССР ахоп дзяцей работніц ясельнай сеткай узрос да 40 проц. у 1928 г. было ў прамысловых цэнтрах і гарадох 31.955 ясельных месц, а да пачатку першага году другой пяцігодкі мы маем рост да 206.500 ясельных месц. Павялічыўся так сама ахоп дзяцей раньняга ўзросту грамадзкім харчаваньнем, якое даведзена да штодзённых 344.500 порцый (у гарадох і прамысловых цэнтрах). Штодзённа ў прамысловых цэнтрах абслугоўваецца 112.500 дзяцей і ў сельскіх мясцовасьцях—24.000. Абслугоўваньне дзяцей работніц саўгасаў і калгасаў сезоннай ясельнай сеткай узрасла са 129.000 месц у 1928 г. да 3.164.200 месц пад канец 1932 году.

Такіх вялізарных результатаў у галіне ясельнага абслугоўваньня работніц калгасаў можна было дасягнуць толькі пры сыстэматычных клопатах партыі і савецкай улады аб грамадзкім выхаваньні дзяцей, толькі пры вялізарным росьце жывагабітнага дабрабыту нашай краіны, пры росьце індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, у результаце пэўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, жорсткай барацьбы з клясавымі ворагамі і апартуністамі ўсіх масьцей і толкаў.

Такой шырокай, усебаковай абароны правоў і інтарэсаў маці, аховы правоў дзіцяці, якую праводзіць і ажыцьцяўляе савецкае заканадаўства, ня ведае ні адна краіна, ні адно заканадаўства ў сьвеце.

Ленін па гэтаму поваду пісаў: **«Мы не пакінулі ў сапраўдным сэнсе слова каменя на камені з тых подлых законаў аб няроўнапраўі жанчыны, аб абмежаваньнях разводу, аб агідных фармальнасьцях, яго абстаўляючых, аб няпрызнаньні няшлюбных дзяцей, аб адшуканьні іх бацькоў і інш. законаў, рэшткі якіх шматлікія ва ўсіх цывілізаваных краінах, да ганьбы буржуазіі і капіталізму».**

У капіталістычных краінах работніца-матка нясе падвойны цяжар прыгнечаньня; яна прыгнечана, як работніца, у сваёй прафэсыянальнай дзейнасьці, яна прыгнечана, як матка і жонка, у сямейным быту.

Такое-ж было становішча працоўнай жанчыны і ў царскай Расіі. **Толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя прынесла сапраўднае вызваленьне і разьвяленьне на жанчыне ў эканамічных адносінах і ў сямейным быту.**

Жанчына ў Савецкай краіне ня толькі зраўнана з мужчынай. Мы маем цэлы рад заканадаўчых норм, спэцыяльна ахоўваючых жанчыну, як раней прыгнечаную істоту, якія маральна ахоўваюць яе ў сямейным быту і ў прафэсыянальнай дзейнасьці, якія стваряюць для яе рад прывілеяў, як для маткі, і ахоўваюць яе дзіця. Праз усё заканадаўства аб сям'і і шлюбе чырвоная нітка праходзіць абарона інтарэсаў маці і дзіцяці: наша заканадаўства аб сям'і і шлюбе зьнічыла ўяўлянню ў сьвеце цалкам і поўнасьцю падначаленае становішча жанчын, як жонкі і маткі.

Поўнае разьвяленьне працоўнай жанчыны можна было ажыцьцявіць толькі пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Толькі ва ўмовах савецкай рэчаіснасьці, толькі пасьля ліквідацыі прыватнай уласнасьці, толькі ва ўмовах савецкай дзяржавы магчыма сумяшчэньне прафэсыянальнай работы жанчыны з яе абавязкам мацярынства.

Праца жанчыны ахоўваецца настолькі шырока, што яна ня ў шкоду мацярынству. Мацярынства ахоўваецца настолькі шырока, што яно сумяшчальна з масавым уцягненьнем жанчын у вытворчасьць.

Лепшым паказальнікам эфэктыўнасьці і пасьпяховасьці савецкага заканадаўства аб ахове маці і дзіцяці, эфэктыўнасьці ўсіх мерапрыемстваў, што праводзяцца ў жыцьцё па ахове маці і дзіцяці, зьяўляецца зьмяншэньне дзіцячай сьмяротнасьці. Дзіцячая сьмяротнасьць на 1.000 народжаных дзяцей у 1910 г. складала 29,7 проц., а ў 1928 годзе—16,4 проц. (па РСФСР). Сьмяротнасьць насельніцтва паменшылася ў параўнаньні з даваенным часам на 36 проц. па агульнай і 42,59 проц. па дзіцячай лініі, а штогодні прырост насельніцтва складае ў нас 3 млн. душ.

Асноўныя палажэньні аховы працы матак паводле нашага кодэксу аб працы зводзяцца да наступнага:

1. Цяжарная жанчына, занятая фізычнай працай, вызваляецца ад работы на працягу 8 тыдняў да радоў і 8 тыдняў пасьля радоў. Занятыя канторскай і разумовай працай—на працягу шасьці тыдняў да і 6 тыдняў пасьля радоў. Закон спакойн складзеным НКП сьпісам прафэсый канторскай і разумовай працы, для якіх, з прычыны іх асаблівасьцяй, тэрмін водпускаў па цяжарнасьці прыроўнываецца да агоб фізычнай працы, г. зн. устаноўляецца ў 16 тыдняў.

У цяперашні момант каля 70 прафэсій канторскай і разумовай працы кары стаюцца наровні з асобамі фізычнай працы 16-тыднёвым водпускам. Па дэкретных водпусках на роды ў 1931 г. касы сацстраху выплацілі 58.617.227 руб. па 355.218 чалавек, што складае звыш 42 млн. працадзён, на якія маткі-работніцы былі адшпічаны з вытвор часьці. Акрамя гэтага, работніцам і жонкам працоўных выдана за 1931 г. на кармленьне 33.095.242 руб., на догляд дзіцяці—18.887.780. Усяго ў 1931 г. — 110.600.249 руб., а за першую палову 1932 г. на ўсе паказаныя вышэй мерапрыемствы выдана 67.315.360 руб.

2. У часе водпуску па цяжарнасьці жанчына ня можа быць зволена. Пасьля звароту на работу ёй павінна быць прадастаўлена выкананьне тэй работы, якую яна выконвала да водпуску. Цяжарная жанчына, пачынаючы з 5-га месяца цяжарнасьці, не падлягае пасылцы ў камандыроўкі без яе згоды на гэта.

3. Ня толькі ў перыяд цяжарнасьці, але і ў перыяд кармленьня грудзьмі бераржліва ахоўваецца савецкім законам праца жанчын. Для цяжарных, як і для кормячых грудзьмі, не дапускаецца звышчасовая і ночная работа.

Для матак, кормячых грудзьмі, устанаўляюцца адрачаа агульных перапынкаў дадатковыя перапынкі для кармленьня. Перапынкі ўваходзяць у лік рабочага часу.

Зводна асобнай пастановы НКП і НКЗ, выданая у дадатак да кодэксу аб працы, кормячыя грудзьмі маткі маюць пераважнае права на работу ў прадпрыемствах і ўстановах медыцёка ад месца іх пражываньня.

4. У часе водпуску па цяжарнасьці дзяржава забясьпечвае жанчыну ў парадку сацыяльнага страхаваньня, якое выдаецца выключна за кошт дзяржавы і наймальніка, і ні ў якім выпадку не за кошт самой працоўнай.

У парадку сацстрахаваньня выдаецца дапамога па мацярынстве ў разьмерах поўнага заработку работніцам і служачым, належачым да асноўных і прамысловых кадраў; рэшта адрымлівае ¾ і ⅔ свайго заработку. Акрамя таго, пры нараджэньні дзіцяці выдаецца адначасовая дапамога на догляд яго.

Працуючыя па найму атрымліваюць дармовую медыцынскую дапамогу. Калі дзіця хворае і яму неабходзен матчын догляд, матка вызваляецца ад работы і атрымлівае дапамогу па непрацаздольнасьці ў часе хваробы дзіцяці.

Савецкая дзяржава ня толькі адным законадаўствам абараняе абарону маці і дзіцяці. Усе меры прыняты да таго, каб шматлікія законы праводзіліся ў жыцьцё. Для гэтай мэты, між іншым, служаць арганізаваныя ўжо з 1921 г. пры ўстановах аховы маці і дзіцяці спэцыяльныя юрыдычныя кансультацыі або сацыяльна-прававыя кабінэты. Гэтыя кансультацыі маюць спэцыяльнай мэтай аказаць не ўсямерна-бытавой сацыяльнай і прававой дапамогі маці і дзіцяці. Асабліва адчувальнай была юрыдычная і сацыяльная дапамога маткам у часе беспрацоўя. У цяперашні час, з ліквідацыяй беспрацоўя, намаганьні органаў і устаноў аховы мацярынства накіраваны на карэнныя бытавыя паляпшэньні жыцьця рабочай сям'і, на перабудову быту на сацыялістычных пачатках.

«Мы маем тысячу раз права ганарыцца тым, што мы зрабілі ў гэтай галіне» — гаварыў Ленін з поваду законаў аб зраўнаньні жанчын у правах з мужчынай. Мы маем тысячу раз права ганарыцца і ганарымся тым, што зроблена і робіцца ў галіне законадаўчай аховы маці і дзіцяці. Гэта дае магчымасьць мільёнам жанчын прыняць удзел наровні з мужчынамі ў будаўніцтве сацыялістычнай дзяржавы.

Герой першай пяцігодкі — ударніца заводу «Бальшавік» тав. ДЗЯТКО.

„Бальшавіцкая, савецкая рэвалюцыя падрэзвае карэньні прыгнечаньня і няроўнасьці жанчын так глыбока, як не прабавала падрэзаць іх ні адна партыя і ні адна рэвалюцыя ў сьвеце. Ад няроўнасьці жанчыны з мужчынай па закону ў нас, у Савецкай Расіі, не заставалася і сьледу. Асабліва агідная, подлая, крывадушная няроўнасьць у шлюбным і сямейным праве, няроўнасьць у адносінах да дзіцяці зьнішчана савецкай уладай поўнасьцю.

Гэта—першы толькі крок да вызваленьня жанчыны. Але ні адна з буржуазных, хаця-б і найбольш дэмакратычных рэспублік, не адважылася зрабіць і гэтага першага кроку. Не адважылася са страху перад „сьвяшчэннай прыватнай уласнасьцю“.

Другі і галоўны крок—скасаваньне прыватнай уласнасьці на зямлю, фабрыкі, заводы. Гэтым і толькі гэтым адкрываецца шлях для поўнага і сапраўднага вызваленьня жанчыны, вызваленьня не ад „хатняга рабства“ шляхам пераходу ад дробнай аднаасобнай хатняй гаспадаркі да буйнай аграмаднай“

ЛЕНІН.

Тав. КАСЬЦЯЛЕЦКАЯ, член камуны «Бальшавік» (Караліцчанскі сельсавет, Менскага району) была ўдзельніцай 1-га ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў.

Шлях батрачкі Ганулі

1.

Адрымела навальніца франтоў... Шырока распасьцерлася абшары савецкай зямлі.

Назаўсёды разьвітаўся абшарнік Зубаў са сваім маёнткам «Глуша». Пад сьвіст кулямётнага маршу ўцёк абшар нік за Буг, пад ахову «Жочы Пасполітай».

На мяжы вырас густы частакол штыхоў Чырвонай арміі, пад вернай аховай разгарнуліся мірнае будаўніцтва ў краіне Саветаў. Глушанскія батракі, выпакутаваўшы права на спакой, узяліся дзяліць палітую іх потам і крывёю абшарніцкую зямлю.

Палеткі шырокага поля раздрабніліся на дзесяткі загонаў, батрацкіх хутароў. Па суседзтву з раскошнай абшарніцкай сядзібай грыбамі высьлі будынкі новых гаспадарачак.

Васілю Несьцяровічу пастаўся 3-х гэктарны надзел. Прадаўшы карову, ён купіў у суседняй вёсцы восець на хату. Гэта быў першы крок новага гаспадара.

Але ня ўцёк Васіль ад бяды і ў заўгарай восеці, якую з гонарам зваў «мая хата». Малыя дзеці, гворая жонка, без каровы, без каня... Зямля заростала быльнягом, мучыла гаспадара.

Па зьвярынаму грызься Васіль з нядоляй. Грызься і ўдаўся...

Яшчэ ніжэй навісьлі хмары жыцьця над восецьцю. Яшчэ ніжэй схіліла галаву заўдавеўшая Акуліна. Прыбавілася агвар для крывасмока кулака.

Здала Акуліна сваю зямлю на часьць. Парапыла ісьці ў заработкі. У той блегі час старшай дачкі Несьцяровічаў — Ганулькі — мінула 10 год. З нутаю ў руках, са зробай торбай за плячыма, пад каждзом і ў сьлякоту, ля кулацкай жывёлы — так праходзіла дзяцінства Ганулькі.

II.

Нямала часу прайшло пакуль глушанскія батракі зразумелі, што і на вольнай зямлі яны заставаліся доўгі час навольнымі паконьнікамі беднасьці. І потым...

Хваля будаўніцтва калгасаў, паток прыліву ў іх працоўнага сялянства — пратэст супроць старога і прыгнётанае новага.

Гэта было ў 1929 годзе...

Напалоханая зьменамі жыцьця Акуліна не адразу разгледзела ў калгасе свой ратунак. Малодая-ж яе дачка Ганулька сьмялей глядзела ўперад. Яна зрабула адразу — калгас для іх, Несьцяровічаў, шляхам правільны і самы просты шлях да лепшага жыцьця. Нямала прайшла горкіх сьлёз Ганулька за матчыну ўпартасьць. І толькі на другі год, летам 1930 г. сьпіс калгаснікаў папоўнілся новай сям'ёй. Ганулька стала калгасьніцай.

III.

Коні запрэжна перастаўляюць ногі. Шчыльна прыляпіўшы гамуты да пояську, імкнуцца ў напрыжыцьці ўзяцьцы вялікі пакуты. Сьмяліва ўзяцца грабі жалезныя, прыгнаюць на стол машыны, высахлае на сонцы жыта. Суха пастае вострае вуб'е штангі, падразаючы сьцяблы саломы. Голіць машына шчацінну пасеву.

З кожным заездам ліпне жытні палетак. Граблі штосьнуцдна скідаюць на іржышча пукі парэзанага жыта. Сьледам за машынай бегаюць вязальшчыцы. Тут і Гануля. Яна спрытна з бясформеннага пласта выробляе тугія снапы.

Трэба пасьпець сьледам за жнівяркай. Для кожнай з 6-ці вязальшчыц адрэзана дыстанцыя, на якой яна абвязана сьледам за машынай зьвязаць усе снапы. Гэта — норма выпрацоўкі. Працаваць за жнівяркай усёроўна, што па канвэеру. Спраўляйся, а то, калі застанецца запас, ён будзе ўсё больш узрастаць да канца рабочага дня, і нормы ня выканаеш.

Ня бывае гэтага ў Ганулі. Нават яна і ўдарніца. Жыцьцё навучыла ім цаніць калгасную работу. Яна за ўвесь час работы ў калгасе ня мае ні аднаго прагулу, ні аднаго спазьненьня на работу.

Бесьперапынку рухаецца канвэер работ у калгасе. У гэтым вёры з шалёнчарнальным энтузіязмам працуе Гануля. З дня ў дзень яна ўсё больш уваходзіць у новае жыцьцё і разам з тым расьце павага калгаснікаў да ўдарніцы.

Сьведкай добрасумленнасьці Ганулі — не працадні. За 1932 г. яна выпрацавала 245 працадзён.

Зараз Гануля працуе дакладчыцай на малочнай фэрме калгасу.

Вось яна раніце гоіць ля аборы. Блішчыць вычышчанае работай зубё жалезных вілак. З пад рук Ганулі высьцілаецца роўнае, мяккае, пасьлане мохам і саломай логава для кароў. Потым поіць, корміць жывёлу. Цэлы дзень не праходзіць на фэрме.

Ганарыцца калгас Ганулькай. Старшыня праўленьня ня можа абысьцісь пра яе работу, каб не паказаць вялікі палец.

— Во, работніца! — кажа ён. Лепшая наша ўдарніца.

У першыя людзі выйшла батрачка. Яна выбрана дэлегатам на раённы зьлёт лепшых ударнікаў калгасу. Ён — 19 год. Перад ёй вялікая будучыня калгаснага жыцьця.

IV.

Гануля адна работніца ў сям'і Несьцяровічаў. Маці, пакарэбная мінулым жыцьцём, працаваць ні можа. Два меншыя браты ходзяць у школу.

Гануля заробіла на ўсю сям'ю. Яна на сваю працадні атрымала 65 пудаў збожжавых культур, больш за 100 кг бульбы, 50 пудоў фуражу і 513 пуд. грашыма.

Сям'я Несьцяровічаў спакойна. Яна забясьпечана пачырай працай у калгасе.

Калгас «Ганулі», Бабруйскі раён.

РОСТ КОЛЬКАСЬЦІ РАБОТНІЦ У ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР

Цэнзавая прамысловасьць	Агульн. кольк.	У процантах	У мэталюргіі	Агульн. кольк.	У процантах
1930 г.	13.601	34,2	1926 г.	699	5,6
1931 г.	26.071	35,8	1932 г.	1260	15,5
1932 г.	38.918	42,7			

ШЫРЫЦЦА РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Ва ўмовах найгыбейшага эканамічнага крызісу чацьвертай галоднай зімы, нягучанага беспрацоўя, эксплёатацыі, самелнага голаду, шалёнага тэроры, жорсткіх эксцэдыцый, шыбеніц, на вызваленай Заходняй Беларусі барацьба працоўных гораду і вёскі супроць зьніжэньня зарплаты, супроць грабежніцкага наступленьня на сацыяльнае забесьпячэньне, супроць скарачэньняў, за зямлю без выкупу, барацьба працоўных супроць акупацыі — з кожным днём пашыраецца і завастраецца.

З найзьлікшай сілай учыск акупацыі фашыскага ўраду капіталістаў і абшарнікаў адчувае на сабе жанчына-работніца, а асабліва сялянка.

Працоўная жанчына на Заходняй Беларусі адчувае на сваіх плячох цяжары наступ на жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы. На тэкстыльных фабрыках у Беластоку ў сучасны момант, пры агульным наступленьні на зарплату, фабрыканты зьнізілі зарплату работніцам, у большым разьмеры, чым рабочым. Калі, напрыклад, рабочым выкінулі і так галодную зарплату на 10 проц., дык работніцам — на 15 проц. Тэкстыльшчыцы пры 10—12-гадзінным рабочым дні атрымліваюць 65—70 проц. зарплаты рабочых, г. зн. ня больш 2—2.50 зл. у дзень (1 зл. = 22 кап.).

На шкляных гутах на працягу апошніх 2 год зарплата зьнізана на 30—40 проц. Ня тыцце ў Беластоку жанчыны за тую-ж самую працу, што робіць рабочыя, атрымліваюць замест 2.25 зл. — 2 зл. Умовы працы работніц на гуце надзвычай цяжкія. Ня тыцдзячы на забарону начной працы, работніцы працуюць цэлымі начамі, а часамі і суткамі, стоячы па калені ў вадзе. Вентыляцыі няма. У памяшканьнях дусна. Пыл разьдае дзёгаль. Харчаваньне дрэннае. Усё гэта пашкоджае крэпкае мацаньне і пагоршае эпідэмічнае становішча. Аб працаздольнасьці жанчын і сьмертнасьці.

Ва ўмовах найгыбейшага эканамічнага крызісу чацьвертай галоднай зімы, нягучанага беспрацоўя, эксплёатацыі, самелнага голаду, шалёнага тэроры, жорсткіх эксцэдыцый, шыбеніц, на вызваленай Заходняй Беларусі барацьба працоўных гораду і вёскі супроць зьніжэньня зарплаты, супроць грабежніцкага наступленьня на сацыяльнае забесьпячэньне, супроць скарачэньняў, за зямлю без выкупу, барацьба працоўных супроць акупацыі — з кожным днём пашыраецца і завастраецца.

З найзьлікшай сілай учыск акупацыі фашыскага ўраду капіталістаў і абшарнікаў адчувае на сабе жанчына-работніца, а асабліва сялянка.

Працоўная жанчына на Заходняй Беларусі адчувае на сваіх плячох цяжары наступ на жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы. На тэкстыльных фабрыках у Беластоку ў сучасны момант, пры агульным наступленьні на зарплату, фабрыканты зьнізілі зарплату работніцам, у большым разьмеры, чым рабочым. Калі, напрыклад, рабочым выкінулі і так галодную зарплату на 10 проц., дык работніцам — на 15 проц. Тэкстыльшчыцы пры 10—12-гадзінным рабочым дні атрымліваюць 65—70 проц. зарплаты рабочых, г. зн. ня больш 2—2.50 зл. у дзень (1 зл. = 22 кап.).

На шкляных гутах на працягу апошніх 2 год зарплата зьнізана на 30—40 проц. Ня тыцце ў Беластоку жанчыны за тую-ж самую працу, што робіць рабочыя, атрымліваюць замест 2.25 зл. — 2 зл. Умовы працы работніц на гуце надзвычай цяжкія. Ня тыцдзячы на забарону начной працы, работніцы працуюць цэлымі начамі, а часамі і суткамі, стоячы па калені ў вадзе. Вентыляцыі няма. У памяшканьнях дусна. Пыл разьдае дзёгаль. Харчаваньне дрэннае. Усё гэта пашкоджае крэпкае мацаньне і пагоршае эпідэмічнае становішча. Аб працаздольнасьці жанчын і сьмертнасьці.

Аб працаздольнасьці жанчын і сьмертнасьці працы на Заходняй Беларусі можна выкінуць наступны факт. Работніцы тытуневай фабрыкі ў Вільні [illegible]

[illegible] на нашай фабрыцы пры [illegible] ле працавала 6 работніц, якія абслугоўвалі 16 варштатаў махоркі, а зараз скарочана да 3-х работніц, якіх абслугоўваць 34 варштаты.

На лепшае становішча работніц і ў машынным аддзяленьні, дзе выробляюць гільзы і папяросы: матор настольні паскорен, што работніцы ня маюць магчымасьці нават адхіліцца ў прыбіральню. Гэта яшчэ ня ўсё — фабрыканты надумалі паставіць адну работніцу на 2 машыны. Кожная работніца на працягу дня павінна ўпакаваць усе папяросы, выробленыя машынай (на поўным ходзе), а калі яна не спраўляецца в гэтай работай, дык яе ў пакаральне перамяшчаюць у самы шкодны цэх — «у сартыроўку», дзе 90 проц. работніц захворваюць сухотамі. За невыказанае капрызаў майстра, ці за адказ, які майстру не спадабаўся, работніца штрафуецца, а часьцей за ўсё выкідаюць яе на вуліцу...»

Спрашэнны рост беспрацоўя таксама адбіваецца на становішчы працоўнай жанчыны. Падпадаючы нізьмерай эксплёатацыі, абцяжаравая дзяцьмі, працоўная жанчына пакутуе ад беспрацоўя, голаду, дарагоўлі. Большая частка беспрацоўных жанчын ніякіх дапамог не атрымлівае. Голад, жабрацтва, хопад, ніякай надзеі на тое, каб забясьпечыць хлебам сваю сям'ю і сабе — усё гэта вельмі часта штурхае на шлях прастытуцыі, да самагубствае.

Ня ў лепшым становішчы знаходзяцца таксама працоўныя сялянкі. На вёсцы сялянка стоіць пад уцяжкам налаткоўных падзіннасьцяй і зьмеснага голаду, цэлага ад беспрацоўя, ад зьдзекаў абшарнікаў, кулакоў, асадніковаў.

Усё часьцей і мацней чуецца пратэст падзіннаволенай жанчыны на Заходняй Беларусі. Работніцы становішча ў першых радох стачачай барацьбы, прымаюць актыўны ўдзел у дэманстрацыях, на радка знаходзячыся на чале дэманстрацый, у барацьбе з паліцыяй і штрэйкбрэхерамі. Рад стачак у галіне Беларусі, на Заходняй Беларусі, на Заходняй Беларусі пераканчаюць заканчэньнем дакуцуны выключнай сэнсацыі і выбухоўці работніц. У мрачнай заластоўцы [illegible] ку Дамброўскага басейну жонкі рабочых разам з мужамі зьнімалі з работы штрэйкбрэхераў. У часе гэтай забастоўкі рабочыя арганізавалі шматлюдную дэманстрацыю, у якой прымала ўдзел вялікая колькасьць жанчын.

У часе доўгай забастоўкі на тэкстыльных фабрыках у Беластоку супроць зьніжэньня зарплаты і скарачэньня тэкстыльшчыцы стаялі ў першых радох забастоўкі. Яны распрацоўваліся са штрэйкбрэхерамі, зьнімалі іх з прадпрыемстваў Сокал-Вільгерфэліта, Малля і інш., выкопваючых вагоны заказы. На сходах тэкстыльшчыцы здэмаскавалі сацыял-фашыскіх здраднікаў — Капінскую, Регінаві і інш., пусканочы нават у ход кулакі.

Жанчыны пад кіраўніцтвам кампартыі прымалі актыўны ўдзел у 2-х месячнай гераічнай забастоўцы сялянскіх 4.000 хаўных рабочых Беласток Пушчы, прымалі ўдзел у масоўках, арганізаваных забастоўчымі пікетамі на [illegible] 20 кілометрах, [illegible] сборы штарбуны дапамогі [illegible] і [illegible] дамі паліцыі, якая секла бастуючых нагайкамі і парола штыхамі.

Жанчыны правялі надзвычайную актыўнасьць і мужнасьць у барацьбе са штрэйкбрэхерамі у забастоўцы возчыкаў, ахапіўшай каля 50 вёсак Пружанскага раёну.

Нам пішуць аптуль: — «Кушец нанёў штрэйкбрэхераў з 13-цю падводамі для вазкі дроў. Пікеты з жанчын і дзяцей, заўважыўшы штрэйкбрэхераў, разагналі ў 5 вёсак чырвоных галоў за дапамогай. З вакольных вёсак зьбегалася каля 50 жанчын і загнаралі штрэйкбрэхерам дарогу. Але прыбыла паліцыя, якая нагайкамі разагнала натоўп жанчын і многіх арыштавала».

Шмат фактаў сьведчыць аб тым, што працоўная сялянка становішча актыўнейшым удзельніцам у забастовачнай барацьбе на вёсцы. У Агароцніках, Берасьцейскай акрузе, 40 батрачак забастоўвалі з пана, патрабуючы павышэньня зарплаты з 85 проц. да 1 зл. У маёнтках Царысцыто і Тынчына пад кіраўніцтвам партыі выбухнула забастоўка батрачак за скарачэньне рабочага дня з 12 да 8 гадзін, за павышэньне зарплаты. Бастуючыя батрачкі адгрэва пакалашчай штрэйкбрэхераў і прасьлалі іх з поля. Пэмпчыцку не ўдалося адамаць салідарнасьць і рашучасьці бастуючых і ён прымушан быў задавольніць іх патрабаваньні.

Працоўныя жанчыны актыўна змагаюцца ў радох нацыянальна-вызваленчага руху, прымаюць удзел у барацьбе пастаўшых супроць нацыянальнага ўціску сялян Камень-Каширскіх, Асташына. Дзюць адпор карным экспедыцыям, польскім жандарам у Бяразнях, Дамачове і інш. Жанчыны прымалі ўдзел у масавых пратестах супроць фашыцкай расправы над стойкім правадыром нацыянальна-вызваленчага руху тав. Тарашкевічам, змагаючыся за школу на родной мове. Працоўная жанчына на Зах. Беларусі выдзяляецца вельмі часта застрэльшчыкам у барацьбе за зямлю без выкупу, супроць падаткаў і г. д.

Сялянкі на Угадаўскім раёне прагналі сэкстэратара, які крыўдзіў сабраць у іх мінулым годзе, прычым яна ў [illegible] [illegible] 20 [illegible] [illegible] і [illegible] [illegible] [illegible]

Разьняволеная працоўная жанчына Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі на чале з правадыром сусьветнага пралетарыяту т. Сталіным, ідзе ў перадавых радох змагароў за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва

Калгасьніцы! Дэлегаткі! Дэпутаткі саветаў! Будзьце ў перадавых радох змагароў па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы ў 33 годзе. Змагайцеся за культурную апрацоўку палёў, за высокі ўраджай, за поўную перамогу бальшавіцкай сяўбы.

Аб укараненьні жаночай працы ва ўсе галіны прамысловасьці і сельскай гаспадаркі і вылучэньні жанчын на адказную кіруючую работу

Пастанова прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Бурны рост сацыялістычнай прамысловасьці БССР і рост матар'яльнага і культурна-бытавога абслугоўваньня працоўных забясьпечылі значнае павялічэньне колькасьці работніц на прадпрыемствах і іх удзельнай вагі сярод рабочых (у 1930 г. было работніц у цэхавай прамысловасьці 34,2 проц., у 1931 г. — 35,8 проц. і ў 1932 г. — 42,7 проц., абсалютная колькасьць работніц павялічылася за тры гады з 13.601 да **38.918 чал.**). Гэты рост дасягнут ня толькі ў лёгкай прамысловасьці (шпэйная з 44,9 да 75 проц., галянтарэйная з 58 да 69 проц.), але і па такіх галінах, як мэталапрацоўчая, у якой удзельная вага жанчын павялічылася з **10** да **15,5 проц.**, дроваапрацоўчая — з **15** да **31 проц.**

Сацыялістычная рэканструкцыя і рост спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР забясьпечылі максымальнае скарыстаньне жаночай працы ў саўгасах і калгасах і ўкараненьне яе ва ўсе галіны сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

Побач з гэтым у справе ўцягненьня жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва з боку наркаматаў, гаспадарчых, каапэрацыйных і прафсаюзных арганізацый ёсьць недацэнка жаночай працы. Канкрэтна гэта праяўляецца:

а) у невыстарчальнай увазе наркаматаў, гаспадарчых органаў і каапэрацыйных арганізацый да пытаньняў павышэньня кваліфікацыі жаночай працы. У выніку гэтага назіраецца слабае ўкараненьне жаночай працы на работах высокай кваліфікацыі, значная цякучасьць і памяншэньне ўдзельнай вагі іх у паасобных галінах прамысловасьці (у тэкстыльнай з 85 проц. у 1931 г. **да 79 проц. у 1932 годзе**);

б) у адсутнасьці ўвагі наркаматаў, РВК, гаспадарчых органаў і каапэрацыйных арганізацый да замацаваньня жанчын-вылучэнак на кіруючай работе, у невыстарчальнай штодзённай ім дапамозе, у выніку чаго зьменшылася колькасьць жанчын на кіруючай, асабліва на савецкай работе (старшыні сельсаветаў у 1931 г. было 72 чал., зараз 29); надзвычай нізкі процант жанчын на кіруючай работе ў калгасах, прафсаюзах і прадпрыемствах (старшынь калгасаў 18 чал.; старшынь ЦП саюзаў — 1, РПС — 2, **у шэйнай прамысловасьці — ні адзін жаночы старшыні фабкому**);

в) пры пазыўсьці ў калгасах пераважная частка жаночай рабочай сілы (у сярэднім па БССР лічыцца на кожны калгас мужчын — 51, жанчын — 56, па МТЭФ: мужчын — 71, жанчын — 78, СТКФ: мужчын — 67, жанчын — 74, па калгасах, што абслугоўваюцца МТС: мужчын — 61, жанчын — 65), удзельнае іх у вытворчую работу застаецца яшчэ надзвычай нізкім: 34,2 проц. жанчын калгаснікаў выпрацавалі за 1932 г. менш 50 працадзён кожная;

г) у невыстарчальнай увазе з боку дзяржаўных, гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый да справы культурна-бытавога абслугоўваньня работніц і калгасьніц, асабліва па лініі наркаматаў цяжкай і лёгкай прамысловасьці і Наркамзему.

Выходзячы з пастаноў ЦК КП(б)Б, ЦК УсеКП(б) і прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР па пытаньнях укараненьня жанчын ва ўсе галіны сацыялістычнага будаўніцтва і паляпшэньня культурна-бытавога абслугоўваньня працоўных жанчын, а таксама ў мэтах далейшага ўкараненьня жаночай працы ва ўсе галіны прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, у мэтах падрыхтоўкі жаночых кадраў і вылучэньня іх на адказную кіруючую работу, прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Дзяржпляну пад адказнасьць тав. **Пятровіча** і Наркампрацы пад адказнасьць тав. **Баскіна** ўстанавіць да 5 сакавіка 1933 г. кантрольныя лічбы жаночай працы па асобных галінах прамысловасьці і асобных буйных прадпрыемствах, забясьпечыўшы кантроль над готай справай на месцах з боку інспэктараў працы і плянавых аддзелаў гарсавету і РВК. Абавязаць дырэктараў трэстаў і прадпрыемстваў высьвятліць патрэбнасьць у жаночай рабочай сіле і пляны камплектаваньня, падрыхтоўкі і павышэньня кваліфікацыі жаночых кадраў і паляпшэньня іх культурна-бытавога абслугоўваньня.

2. Для замацаваньня работніц на вытворчасьці, асабліва ў тых галінах прамысловасьці, дзе рашаючую ролю адыгрывае жаночая праца, прапанаваць НКЛёгпраму, пад адказнасьць тав. **Грысевіча**, упаўнаважанаму НКЦяжпраму — тав. **Амбрамунаса**, упаўнаркамлесу — тав **Розіна**, Наркамснабу, пад адказнасьць тав. **Балціна**, забясьпечыць правядзеньне мерапрыемстваў па паляпшэньні кваліфікацыі работніц праз курсы, гурткі, індывідуальнае навучаньне і інш. з тым, каб на пачатку 1933 г. забясьпечыць ліквідацыю наўгнай разьбежкі паміж агульнай удзельнай вагой жаночай рабочай сілы і ўдзельнай вагой тэхнічна кваліфікаваных жаночых кадраў у прамысловасьці і сельскай гаспадарцы.

3. Закончыць у першай палове 1933 г. будаўніцтва ясьляй на фабрыцы «Дзьвіна», шаўковай, абутковай, абавязаўшы органы жыллаапэрацыі неадкладна прыступіць да выкананьня пастаноў партыі і ўраду аб будаўніцтве дзіцячых устаноў, асабліва ў дамох каапэрацыі, якія будуюцца. НК РСІ праверыць правільнасьць і эфэктыўнасьць выдаткаваньня ў 1933 г. сродкаў на бытавыя мерапрыемствы па лініі Цустраху і ў калгасной сыстэме.

4. Прапанаваць аддзелу кадраў прэзыдыуму ЦВК праверыць і далажыць на бліжэйшым пасяджэньні прэзыдыуму аб ходзе выкананьня вераськёўскай пастановы ЦК КП(б)Б і ЦВК аб вылучэньні работніц і калгасьніц на кіруючую работу. Абавязаць Наркамзем, пад адказнасьць тав. **Рачыцкага**, і ўпаўнаважанага Наркамзем-саўгасаў тав. **Жолудава забясьпечыць больш рашучае вылучэньне** жанчын на вытворчую і адміністрацыйную гаспадарчую работу ў саўгасах і калгасах, падрыхтоўку іх праз курсы і своячасовае разгортваньне сеткі дзіцячых устаноў у часе палявых работ.

5. Лічачы зусім недапушчальным такое зьяўішча, калі 32 проц. жанчын выпрацавалі ў калгасах у 1932 г. менш 50 працадзён кожная, што сьведчыць аб недаацэнцы работы па ўцягненьні жанчын у калгасную вытворчасьць, абавязаць Наркамзем, райвыканкомы, сельсаветы, МТС і кіраўніцтвы калгасаў зьвярнуць асаблівую ўвагу на скарыстаньне жаночай працы ў калгасах і замацаваньне жанчын на пастаянных работах, вылучаючы лепшых калгасьніц-ударніц у якасьці брыгадзіраў на іншую кваліфікаваную работу.

У мэтах арганізацыі сыстэматычнага бытавога абслугоўваньня работніц і калгасьніц, належнага кіраўніцтва гэтай галіной работы, абавязаць усе наркаматы, гаспадарчыя арганізацыі, Белкаапсаюз, Белсампрамсаюз і інш. уключыць у пляны сваёй работы распрацоўку пытаньняў працы і быту работніц і ўвесьці ў практыку спэцыяльнае абсьледваньне работы раённых і вёзавых органаў і скліканьне пэрыядычных нарад па гэтым пытаньні. Абавязаць усе наркаматы, гаспадарчыя органы і каапэрацыйныя арганізацыі вылучыць аднаго з членаў калегій наркамату, нам. кіраўнікоў гаспадарчых органаў, або члена праўленьня каапэрацыйных цэнтраў, адказных за непасрэднае пастаяннае кіраўніцтва работай сярод жанчын на лініі наркамату, установы, арганізацыі.

6. Наркампрацы праз інстытут арганізацыі працы распрацаваць новы сьпіс прафэсій, на якіх можа быць скарыстана жаночая праца, і сумесна з ЦК НГУ ўстанавіць дыфэрэнцыяваны ўлік жаночых кадраў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

7. Прапанаваць усім РВК і гарсаветам на працягу месячнага тэрміну ўкамплектаваць РВК інструктарамі па рабоце сярод жанчын, адначасова з гэтым устанавіць ва ўсіх сельскіх і местачковых саветах пасаду пазаштатнага намесьніка старшыні савету на жаночай працы.

8. Прапанаваць РВК і гарсаветам праз свае сэкцыі і дэпутацкія групы праверыць выкананьне апошніх пастаноў партыі і ўраду па пытаньні ўцягненьня жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва і паляпшэньні іх бытавога абслугоўваньня ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

26 лютага 1933 г.
г. Менск.

За аўладаньне тэхнікай

Шпарэйя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва пацягнулі за сабой масавае ўцягненьне жанчын у вытворчую працу. Колькасьць занятых у прамысловасьці БССР жанчын на сёньняшні дзень складае 42,3 проц. ад агульнага ліку рабочых.

Жаночая праца знаходзіць сваё месца ва ўсіх галінах нашай сацыялістычнай прамысловасьці. Жанчына ўзорна ўладае і найбольш складанымі працэсамі вытворчасьці.

Жанчына—сьлесар, токар, жанчына—фрэзэроўшчык, мацёр — гэта ўжо зараз звычайнае зьявішча.

Нямала ёсьць зараз у нас жанчын машыністаў, лётчікаў, трактарыстаў, інжынэраў і г. д.

Вось невялікія штрышкі на агульным фоне ўдзелу жанчын у вытворчай дзейнасьці.

На чыгуналіцейным машынабудаўнічым заводзе «Камунар» працуюць з агульнага ліку 565 рабочых 93 жанчыны, з іх 41 работніца непасрэдна ля станкоў.

Пяцігодка стварыла новы тып чалавека—ударніка.

Тав. Кохан—кваліфікаваны сьлесар 3-га разраду і тав. Шыфрына—токар—вось прыкладныя героі пяцігодкі на заводзе «Камунар». Сацыялістычныя формы працы знайшлі сваё вось бітаў і ў жаночым асяродзьдзі. Амаль усе работніцы жанчыны знаходзяцца ва ўдарных брыгадах. З іх дзесяць жанчын-сяброўкі—лепшыя ўдарніцы—вылучаны заводскімі арганізацыямі для прамяжаньня ў дзень «8 сакавіка». Многія работніцы выконваюць складаныя апэрацыі на машынабудаўнічым заводзе.

Сара Гурвіч—камсамолка, актыўны ўдзельнік у грамадзкім жыцьці заводу, працуе сьлесарам-інструманталыпчыкам і выконвае дакладныя работы на горшы за мужчыну. Па словах майстра, Сара Гурвіч расьце не па днёх, а па гадзінах на вытворчасьці. Але Гурвіч не абмяжоўваецца ўсё дасягнутымі ёю ведамі, яна навучаецца далей у тэхнікуме пры заводзе.

Яе пылечнік—тав. **Сальнікава**—таксама энэргічная камсамолка, праца вала доўгі час на заводзе сьлесарам 4-га разраду і была вылучана на адказнейшую грамадзка-вытворчую работу—на пасаду загадчыка БРЫЗ'у. Зараз тав. **Сальнікава паехала займацца ў тэхнічную школу савецкіх лётнікаў.**

Жанчына на сацыялістычнай вытворчасьці—гэта актыўны ўдзельнік і ў грамадзкай працы рабочага калектыву.

Работніца **Акуценка**, сьлесар, лепшая ўдарніца на вытворчасьці, прымае актыўны ўдзел у грамадзка-палітычным жыцьці заводу. Яна добра кіруе дэпутацкай групай на заводзе, за што ня раз была адзначаная арганізацыямі прэміявана.

Завод узяў на сябе адказную работу па дапамозе падшэфнаму сельсавету ў справе падрыхтоўкі яго да вясенняй пасяўной кампаніі. Трэба за што-б гэта ні стала дапамагчы сельсавету арганізаваць с.-г. машыны, каб своячасова выехаць у поле на сяўбу. Работніца тав. Мазаўчная—кваліфікаваны сьлесар 4-га разраду, якая добра разумее важнасьць гэтай палітычнай справы, пасылаецца заводскімі арганізацыямі ў падшэфны сельсавет для дапамогі яму ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Далейшай задачай зьяўляецца асваеньне новай тэхнікі, барацьба за павышэньне якасьці работы нашай сацыялістычнай прамысловасьці.

«У адрозьненьне ад першай пяцігодкі другая пяцігодка будзе пераважна пяцігодкай асваеньня новых прадпрыемстваў прамысловасьці, пяцігодкай арганізацыйнага ўмацаваньня новых прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы... Другая пяцігодка павінна дапоўніць цяперашні лёзунг будаўніцтва новым лёзунгам—асваеньня новых прадпрыемстваў і новай тэхнікі». (З рэзалюцыі стгузенскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Усё гэта патрабуе яшчэ большага павышэньня кваліфікацыі рабочых і работніц на сацыялістычнай вытворчасьці, узбраеньня тэхнічнымі ведамі, набыцьця новых навыкаў для скарыстаньня новай тэхнікі.

Існуючы пры заводзе тэхнікум па павышэньні кваліфікацыі рабочых павінен ахапіць усю масу жанчын, працуючых на заводзе.

Адміністрацыі і заводзкім арганізацыям треба зьвярнуць максымум увагі на паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў жанчына, каб яны яшчэ больш павышалі свае тэхнічную і агульна-палітычную пісьменнасьць.

Ш.

Алена Сабаленка

АЛЕНУ ІЛЬЛІНІШНУ САБАЛЕНКА ў Маскву пасылалі ня толькі ўдарнікі з калгасу імя **ЛЕКЕРТА.**

На сходзе, дзе выбіралі дэлегата на першы ўсесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў, былі таксама і прадстаўнікі «Парыскай камуны», «Чырвонага Залесьсяя» і іншых калгасаў Шацілаўскага сельсавету. У сенцах хаты, дзе зьмяшчаецца праўленьне калгасу, сядзелі і стаялі пматлікія госьці — адпасобнікі...

І Алёна Ільлінішна, прыехаўшы з Масквы, патрацілі ўжо дзесяць дзён, каб зрабіць справаздачу перад калгасьнікамі ня толькі свайго, але і суседніх сельсаветаў.

Восем раз яна выступала ўжо на сходах са справаздачнымі дакладамі аб першым ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў. Восем раз расказвала аб Маскве, аб яе заводах, аэрадромах, тэатрах, аб маскоўскіх рабочых, аб зьезьдзе...

Кожны раз яе слухаюць уважліва і прагавіта, баючыся прапусьціць хоць-бы слова, распытваюць аб усім: як карміці, дзе спаць клалі, аб чым гаварылі на зьезьдзе...

І яшчэ пыталі калгасьнікі:

— Ці праўда, што ёсьць пастанова, каб гультаёў з калгасаў выключаць?

— Ці праўду гаворыць людзі, што вас рабочыя ў госьці да сябе запрашалі?

— Ці бачыла ты т. Сталіна, старога Калініча?

Сотні іншых пытаньняў задавалі калгасьнікі свайму дэлегату. На кожнае пытаньне Алёна давала просты і зразумелы адказ.

НІКОЛІ НАС ТАК НЕ СУСТРАКАЛІ

— У роднай сястры, у бацькі майго ніколі мяне так не сустракалі, калі я да іх прыяжджала ў госьці, як сустрэлі мяне і інш. дэлегатаў у Маскве. З вакзалу нас на машынах павезьлі ў горад, накармілі...

Калгасьнікі напрасілі расказаць, што давалі на сьнеданьне, на абед, на вэчэру.

Сабаленка пералічыла па пальцах.

— Што ты, і гэтак добра кармілі?..

— Затым мы паехалі ў лазьню, вымыліся чыста. Разам са мной была адна ўбэчка. Яна яшчэ гадоў са два назад на твар апранала такую... ну як-бы фіранку — забылася, як гэта

І ЗАГАВАРЫЎ НАШ СТАЛІН...

— Быў у нас на зьезьдзе тав. Сталін, бачыла яго добра. Мы ўсе прасілі тав. Сталіна, каб ён сказаў нам што-небудзь, хацелася, ох як хацелася яго паслухаць.

— А калі ўзышоў ён на трыбуну, дык доўга ня мог гаварыць — усё шыпскалі ў далоні так, нібы такі (іх нам тав. Клім Варашылаў сказаў) разам загрукацелі. Віталі мы т. Сталіна горача і доўга — увесь зьезд аднадушна, усе як адзін.

— І вось загаварыў наш Сталін. Гаварыў проста, зразумела аб нашай роднай калгаснай справе. Гаварыў, як трэба працаваць, гаварыў, што мы павінны вучыцца ў рабочых, што найбольш цяжкія гады ўжо пражыты. Гаварыў, што кожны калгасьнік у нас, у нашай краіне павінен стаць заможным.

— Запамятайце, таварышы, што

„ПРАЎДА, САМІ БАЧЫМ“

— Кулацкае ахвосьце яшчэ ня вытнана з калгасных радоў. Вораг нам усялякі прабуе нашкодзіць. Памятаеце, — гаворыць далей Алёна Ільлінішна, — як у нашым калгасе раней гаспадарылі клясава - варожыя элементы — гандляры і спэкулянты.

Яны за два гады растрацілі 30 тыс. руб. дзяржаўных крэдытаў і напалову папсавалі такое багацьце нашага калгасу, як 15 гэктараў саду. Да чаго-ж мы часта не заўважаем, што вораг робіць у нас на вачох, пад нашым носам!..

Алёна дакладвае калгасьнікам, якая карысьць ад садовай гаспадаркі цяпер, калі з калгасу выпнай шкодзікаў, калі саду дагледае яе — Сабаленкі — брыгада.

Чысты даход ад саду ў мінулым годзе склаў больш 20 тысяч рублёў. Апрача таго, кожны калгасьнік атрымаў ад 10 да 20 пудоў яблык і паўсотні пудоў іншай садавіны і гародніны. У мінулым годзе засаджана 8 гэктараў маладога саду. Кожнае дрэва дагледжана, абрэзана, змазана. Маладняк абвязан і апоплен. Ні аднаго дрэва не папсуе заяц.

Садова-гародняя брыгада — вынучая ў калгасе. Брыгада ня ведае прагулаў. Працавалі летам так, што своячасова і бяз усякіх страт сабралі ўвесь ураджай. Большасьць калгасьнікаў у брыгадзе — ударнікі, якія па некалькі раз прэміяваліся за самаадданую і сумленную работу.

— Так працуе мая брыгада. Мяркуйце самі, праўда ці не?

— Праўда, чаго там, самі бачым.

— Мала, таварышы, аднак, каб у нашым калгасе добра працавала толькі адна брыгада. Траба, каб кожны калгасьнік працаваў так, як працуюць Клябанаў Пётра, Тамашэўская Эмма, Глезэр і інш.

КЛЯБАНАЎ ПЁТРА

Алёна Ільлінішна паказвае рукой на калгасьніка Клябанава Пятра. Яму за семдзесят год. У Пятра сівая барада, але жылістыя яшчэ моцныя рукі. За плячыма — доўгія гады гаротнага жыцьця, кабалы ў панаў і падпанкаў. Біўся Пятро, як рыба аб лёд, на сваёй гаспадарцы, але так і ня зполеў стаць на ногі пакуль ня ўступіў у калгас.

У калгасе Пятро, нарэшце, знайшоў тое, аб чым назад ня мог і марыць за ўсе гады свайго далёкага гаротнага жыцьця. Клябанаў — прыкладны ўдарнік, які ўжо некалькі раз прэміяваўся за перавыкананьне норм, за беражлівае ставленьне да коня, за ашчадную ахову калгаснай маёмасьці.

І вынікі работы Клябанава Пятра ў калгасе зусім іншыя, чымся ў другіх. Пятро пры разьмеркаваньні ўраджаю атрымаў больш за сто пудоў збожжа, 20 пудоў яблык, 120 пудоў бульбы, некалькі сотень рублёў грашыма і г. д.

— Вось, таварышы, які наш Пятро Клябанаў. Ён стары. Але хто болей за яго вывозіў гною за дзень? Няма такога чалавека ў нашым калгасе. Хто больш уважліва адносіцца да кожнай драбніны нашай калгаснай маёмасьці? Рэдкіх таксама мала заойдзецца.

— Вось, усе будзем працаваць так, як Пятро, — і калгас, што стаіць Клябанаў на сваіх ударных плячох, — ...

— Вось, таварышы, які наш першы калгасьнік-ударнік—тав. Сталін сказаў:

«... Калі мы будзем працаваць сумленна, працаваць на сябе, на свае калгасы, — то даб'емся таго, што за якія-небудзь два-тры гады падыдзем усіх калгасьнікаў, былых беднякоў і былых сераднякоў, да ўзроўню заможных, да ўзроўню людзей, якія карыстаюцца багацьцем прадуктаў і вядуць зусім культурнае жыцьцё.

У гэтым цяпер наша бліжэйшая задача. Гэтага мы можам дабіцца, гэтага мы павінны дабіцца ва што-б там ні стала».

— Дык вось, таварышы, мы павінны працаваць лепш, працаваць сумленна, берагчы кожны колас нашага ўраджаю, кожны фунт нашага калгаснага насеньня. Тады і станем мы ўсе калгасьнікі **ЗАМОЖНЫМІ.**

У ТОЙ-ЖА ДЗЕНЬ ПРЫЙШЛІ ЛЮДЗІ З ЗАЯВАМІ...

На сход, калі рабіла сваю справаздачу тав. Сабаленка, у калгас прыйшло больш паўсотні адпасобнікаў. Яны ціхма праслухалі кожнае слова дэлегата, усё, «што казала таварыш дэлегатка аб Маскве».

1 ў той-жа дзень прыйшлі людзі з заявамі... 27 аднаасобнікаў падалі заявы аб прыёме ў калгас імя Лекерта...

Калгасьнікі ўсебакова абмяркоўвалі кожную кандыдатуру, правяралі, што называецца, на костачках: ці выканаў ты свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай, ці зьбярог насеньне, жывёлу, інвэнтар.

15 аднаасобнікаў ужо прынялі. Усе яны апрамаздзілі рабочую скацінку, с.-г. інвэнтар і ссыпалі насеньны і страхавы фонды добраякасным ачышчаным насеньнем...

Дзесяць дзён, якія прайшлі з часу прыезду Алёны, сталі для калгасу днямі самай гарачай, самай дружнай работы за ўсю зіму.

За гэтыя дзесяць дзён калгасьнікі, натхнёныя сваім дэлегатам, цалкам скончылі вывазку лесаматар'ялаў і ўгнаеньняў. Поўнасьцю ачышчана і ссыпана насеньне. Увесь с.-г. інвэнтар адрамантаваны: плугі, бораны, калёсы і г. д. Калгас праводзіць пробны выезд у поле, дзе праверыць сваю гатоўнасьць да першай вясны другой бальшавіцкай пяцігодкі.

Зараз брыгада сталяроў і цесьляроў робіць лапкі, зацяжкі і дзіцячыя ложкі для ясьляй. Брыгада абодзіраў рыхтуе прылады да калёс. Калгас мяркуе ўвесну вывесьці на калгасны рынак некалькі дзесяткаў стагаў калёс.

Калгасьнікі пераглядзелі і ўкавалі нормы выпрацоўкі для ўсіх с.-г. работ. **Дружна, па-баявому, усе,** як адзін, лекерцяўцы змагаюцца за тое, каб першымі і лепш за ўсіх у сельсавеце правесьці сяўбу. Шырыцца зазыўны кліч ударнікаў першай пяцігодкі другой пяцігодкі. На сацыялістычнае спаборніцтва выкліканы калгасы «Парыская камуна» і «Чырвонае Залесьсе».

ПАЙШЛА І ПАЦЯГНУЛА СВАЙГО МУЖЫКА

Алёна Ільлінішна працавала да 1918 г. у Петраградзе на заводзе гранат. У 1918 г. папрацавала яе зноў на зямлю: вярнулася ў вёску.

Першыя гады разам з мужам батрачыла, а потым, адрымаўшы кавалак зямлі, пачала заводзіць уласную гаспадарку.

— Пабудавалі мы хату, сяк-так купілі каня. Праўда, самі ня купілі—дзяржава дапамагла. Потым стараліся, каб паставіць хоць які-небудзь хлявушчак і купіць карову. Не ўдавалася. Потым, калі купілі карову, здох конь. Прышлося мяняць карову на каня. Так і жылі без каровы з малымі дзецьмі.

У 1928 г. пачала вучыцца грамаце разам з большым сынам, у школу хадзіў каторы. Вучылася дома сама, як кажуць, саматугам. Тады і расчыніліся мае вочы. Пайшла ў калгас і мужыка пацягнула.

Прышлі ў калгас імя Лекерта. Глядзю — непарадкі адны. Усё захапілі ў свае рукі былыя гандляры і спэкулянты, ну і арудуюць. Я ў рабо — да райкому партыі, у РВК — так і так кажу, ачысьціце наш калгас, дапамажэце выкінуць ворага. Выкінулі мы гандляроў. Засталося ў калгасе толькі бядняцкія гаспадаркі: чатыры яўрэйскія сем'і і столькі-ж беларусаў. Так і пачалі будаваць гаспадарку... А зараз — вырасьлі, напырыліся — няма з чым і раўнець...

Яшчэ ня было з таго часу, як прышлі Сабаленкі ў калгас, каб с.-г. арцель імя Лекерта ня выказала пагардаў па сяўбе, каб на полі што-небудзь загінула ці засталося ня прыбраным, каб калгас у тэрмін і поўнасьцю ня выканаў сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай па здачы і таварнай прадукцыі. Алёна прагна інтэресуецца аўладаць апранамічнай навукай. У яе ў хаце на палічы ляжаць некалькі дзесяткаў чыганых і перачытаных кнігак, сярод якіх побач з творамі Леніна можна знайсьці і брашуры пра садоўніцтва, пра барацьбу са шкоднікамі, пра ўборку ўраджаю, пра арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Новымі кнігамі — падарункам з Масквы — Алёна Ільлінішна папоўніла сваю небагатую бібліятэчку.

— Раней, чым пасадзіць дрэва, — расказвае тав. Сабаленка, — я ўважна вывучаю глебу. Я наперад папер вядаю, колькі яблыня дасьць урадзкаю і якога, ведаю ўсе слабасьці і хваробы дрэва.

„ТАКАЯ МАГУТНАЯ МАЯ КРАІНА“

Алёна Ільлінішна прапавала на петраградзкім заводзе, калі ля варот чырвонага Піцеру стаялі банды Юдзеніча, калі рабочы атрымліваў па некалькі васьмушак хлеба напалову з высеўкамі, калі Масква нагадвала галодную вялікую вёску... І Алёна зьдзівілася ня менш, чым кожны калгасьнік-дэлегат, калі прыехаўшы на зьезд у чырвоную сталіцу, пабачыла яе цяперашняе жыцьцё. Не магла Алёна без хваляваньня расказваць калгасьнікам пра аўтазавод імя т. Сталіна, пра «такую вялікую аэрамашынную станцыю» (аэрадром), пра тое, як жывуць цяпер маскоўскія пралетары ў новых дамах, у новых сьвецкіх кватэрах.

— Калі падумала я на ўсё гэта — ёкнула сэрца ад радасьці. Па ведала, што такая магутная мая краіна... Хіба ня будзе біцца сэрца ад радасьці, калі там, дзе раней нарабляліся заклятыя, цяпер вытвараюцца машыны, трактары, самалёты.

* *

Тав. Кагановіч, кіруючы сваёй дакладай на [illegible] калгас[illegible] [illegible] Сталіну:

«На вас, ударніках, якія сабраліся на першы ўсесаюзны зьезд, ляжыць адказнасьць ня толькі за вялікі брыгады і калгасы. Вы павінны расказаць аб роўнае сваёй работы, аб тым, што вы атрымаеце на гэтым зьезьдзе, ня толькі членам вашых калгасаў, але і паўколькіх калгасаў. Вы павінны заразіць вашым энтузіязмам калгасныя масы і ўзьняць іх на пасьпяховае правядзеньне бальшавіцкай веснавой сяўбы».

Алёна Сабаленка — дэлегат першага ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў — з гонарам выконвае наказ тав. Кагановіча.

На яе ініцыятыве пырокі разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі Шацілаўскага сельсавету, паміж калгаснымі брыгадамі і паасобнымі калгасьнікамі на лепшае правядзеньне сяўбы правых.

Сваім энтузіязмам, сваёй адданасьцю калгаснай працы яна заразіла [illegible] калгасьнікаў, яна [illegible] адзінаадушшу.

Любяць і паважаюць калгасьнікі свае [illegible] Алёну Ільлінішну [illegible].

Попадзік, сакрэт. Ул. [illegible]

Грызьня ў фашысцкім лягеры

Гітлер дабіваецца „паўнаты ўлады“

АМСТЭРДАМ, 5. Згодна вестак, атрыманых з Бэрліну, бліжэйшыя дні будуць запоўнены барацьбой за ўсю ўладу. Падрыхтоўкай да гэтай барацьбы зьявіўся падпал рэйхстагу, які магчыма замяніў меркаваны раней фіктыўны замах на Гітлера. Аднак магчыма, што гэты замах яшчэ будзе інсцэніраваны. На абываталяў усё гэта цікавяньне, як відаць, уплывала мацней, чым гэта можна было меркаваць.

У Германіі мяркуюць, што нацыянал-сацыялісты выступяць зараз-жа пасьля выбараў.

У першую чаргу Гітлер паспрабуе адхіліць Гіндэнбурга. Першапачаткова меркавалася адстаўка Гіндэнбурга і абвяшчэньне Гітлера прэзыдэнтам. Плян гэты, аднак, прыпынілся зьмяніць, бо аб ім даведаліся германскія нацыяналісты. Хочуць прапанаваць Гіндэнбургу перадаць усю ўладу Гітлеру, пагражаючы яму ў праціўным выпадку самай вострай апазыцыяй, а можабыць чым-небудзь і горшым.

Правыя прымаюць контр-меры. **У Дэбэрыцкі лягер, недалёка ад Бэрліну, сьцягваюцца атрады рэйхсвэру.** Па чутках, Гіндэнбург пакіне Бэрлін папярэдняй выбараў і, магчыма, паедзе ў Дэбэрыц. Калі Гітлер паспрабуе зрабіць путч, цык Папэн будзе назначан рэйхсканцлерам, генерал фон-Бломбэрг — галоўнакамандуючым, і будзе ўстаноўлена ваенная дыктатура.

Паводле іншых вестак, гітлераўскі путч назначаны на 13 сакавіка.

У сувязі з гэтым ёсьць наступнае паведамленьне прэсбюро баявога чорна-бела-чырвонага фронту: «Шчасьце Германіі ў тым, што ў гэты крытычны момант на чале выканаўчай улады стаіць прускі камісар фон-Папэн. Мэтаімкнёная цьвёрдасьць Папэна зьяўляецца гарантыяй перамогі бальшавіцкай небясьпекі, а таксама захаваньня парадку і законнасьці. Кіраўніцтва выканаўчай уладай, якое знаходзіцца ў руках Папэна, зьяўляецца гарантыяй супроць усякага свавольства, гвалтоўнага панаваньня і разьюшанасьці недзяржаўных сіл».

Гэта зьяўляецца выразнай перасьпярогай па адрасу нацыянал-сацыялістаў і нацыяналістаў, якія выказваюць паведамленьні аб падзеях, якія рыхтуюцца».

Высылка французскіх журналістаў з Германіі

ЛЁНДАН, 6. Як падае **«Манчэстэр Гардыян»** у сувязі з тым, што бэрлінскім карэспандэнтам французскіх газэт **«Піці Парызьен» і «Эко-дэ Пары»**, а таксама карэспандэнту афіцыёзнага агенцтва Гавас пагражала неадкладная высылка з Германіі, **французкі пасол зрабіў прадстаўленьне германскаму ўраду.** Умяшаньне пасла не аказала ніякага дзеяньня і ён зьвярнуўся ў Парыж за інструкцыямі. Французкае міністэрства замежных спраў даручыла паслу заявіць германскаму ўраду, што **за кожнага высланага з Германіі французкага карэспандэнта будуць высланы з Францыі два германскія карэспандэнты.**

Бэрлінскі карэспандэнт «Манчэстэр Гардыян», паведамляючы гэта, дадае, што па яго вестках пасьля гэтай заявы было пастаноўлена выслаць пакуль толькі карэспандэнта «Піці Парызьен». Па словах **«Манчэстэр Гардыян»** карэспандэнты выклікалі незадавальненьне германскага ўраду сваімі паведамленьнямі аб сувязях арыштаванага праваката Ван-дэр-Любэ з фашысцкімі колам.

Даведаўшыся, што карэспандэнт «Піці Парызьен» падлягае высылцы, — піша далей «Манчэстэр Гардыян», — французкі ўрад даўёў да ведама германскага ўраду, што ён выпле з Парыжу двух карэспандэнтаў прэсы Гугенбэрга (міністра гаспадаркі ў кабінэце Гітлера, уласьніка многіх газэт і тэлеграфнага агенцтва «Тэлеграфэн Унён»).

Пасьля гэтага, — піша далей газэта, — германскі ўрад патрабаваў ад Лютрэ — карэспандэнта «Піці Парызьен» пісьмовага прабачэньня. Лютрэ адмовіўся. Пасьля гэтага паслядвала рашэньне высылаць Лютрэ з Германіі (па другой версіі з Прусіі) толькі на два месяцы, але і гэта пастанова ня лічыцца канчатковай.

Карэспандэнт **«Таймс»** паведамляе, што загад аб высылцы Лютрэ затрыманы ў чаканьні рэзультату перагавораў, якія вядуцца ў цяперашні час.

Водгукі на нямецкія выбары за мяжою

У Польшчы

ВАРШАВА, 6. Гаворачы аб рэзультатах выбараў у Германіі «Нашэ Пшэглёнд» падкрэсьлівае, што, «ня гледзячы на ліквідацыю амаль усёй прапаганды апазыцыі», Гітлеру не ўдалося дабіцца абсалютнай большасьці галасоў. Такім чынам, — дадае газэта, — без дапамогі Гугенбэрга і зьвязанага з ім «Сталёвага шлему» каліцыйны габінэт ня зможа атрымаць шырокіх упаўнаважаньняў парляманцкім шляхам.

Левыя элементы, — піша далей газэта, — выкрылі нечаканую сілу супраціўленьня, якой ня здолелі паралізаваць ні рэпрэсіі, ні дэмагагічная «антымарксцкая агітацыя».

У выніку газэта заяўляе, што лёзунг зьнішчэньня клясавага пралетарскага руху аказаўся пустым гукам».

У Англіі

ЛЁНДАН, 6. Бэрлінскія карэспандэнты ангельскіх газэт падкрэсьліваюць, што ў створанай абстаноўцы **рэзультаты выбараў трэба прызнаць спрыяючымі для камуністаў.** Нават карэспандэнт цьвёрдалобай **«Морнінг пост»** прызнае, што «камуністы і сацыялісты мелі посьпех». Што датычыць далейшых пэрспэктыў, то па думцы гэтага карэспандэнта, **Гітлер** у бліжэйшы час выкарыстае сваю моцную парляманцкую пазыцыю для таго, каб парваць згоду з нацыяналістамі. Карэспандэнт **«Дэйлі мэль»** мяркуе, што захват **Гамбургу** фашыстамі мае большае значэньне, чым рэзультат выбараў. Цэнтральны ўрад Германіі, гаворыць карэспандэнт, мае намер раздушыць усе германскія дзяржавы, урады якіх не пакідаюць салідарызавацца з нацыянал-сацыялістамі.

«Манчэстэр Гардыян» піша: «Няхай ніхто ня думае, што германская «мірная» нязеля азначае, што небясьпека пагрому не існавала і ня існуе, пакуль у кіраўніцтве нацыянал-сацыялістаў ёсьць дзікія людзі і авантурнікі, існуе небясьпека патрэмаў ня толькі ў адносінах да камуністаў, але і сацыял-дэмакратаў і яўрэяў і ўсіх, хто не падзяляе веры ў догмы новага нацыянальнага эвангельля».

ПАДПАЛЬШЧЫК ВАН-ДЭР-ЛЮБЭ — НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТ

ПРАГА, 5. Як падае дрэздэнскі орган нямецкіх с.-д. у Чэха-Славакіі), карэспандэнт «Сацыял-дэмакрата» (орган Ван-дэр-Любэ ў ліпені 1932 году затрымліваўся ў абшчыне Сернявіц (акруга Мэйсен, Саксонія), БЫЎ У СУВЯЗІ З ТАМАШНІМІ НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТАМІ і заяўляў, што ён НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТ.

***

ПРАГА, 6. Орган чэскіх сацыял-дэмакратаў **«Сацыял-дэмакрат»** піша: «З Майсэну (Саксонія) паведамляюць што сацыял-дэмакратычныя дэпутаты паведамілі сёньня саксонскага міністра Рыхтэра аб тым, што падпальшчык рэйхстагу Ван-дэр-Любэ 1-га чэрвеня 1932 году начаваў згодна прыпісцы ў абшчыне Зернавіц. Кіруючым членам нацыянал-сацыялістскай партыі, члену мясцовага самакіраўніцтва Зомэру, а таксама зямляўласьніку Шуману Ван-дэр-Любэ заявіў, што **ён нацыянал - сацыяліст.** У Зомэра Ванд-эр-Любэ заставаўся два дні, а затым Ван-дэр-Любэ зьнік. Ван-дэр-Любэ заявіў Зомэру, што **ў Германіі ў кастрычніку выбухне грамадзянская вайна** і што нацыянал-сацыялістская партыя ва ўсеўзбраеньні. Зомэр пацьвёрдзіў усё гэтае паведамленьне бургамістру Броўвіц.

Саксонскі ўрад, паінфармаваны аб гэтым, згадзіўся неадкладна прыступіць да сьледзтва. Усегерманскі ўрад, а таксама дэпутаты рэйхстагу прэінфармаваны тэлеграфна. Крымінальная паліцыя адправілася з Дрэздэну ў Мэйсэн.

Напярэдадні ўсеагульнай забастоўкі тэкстыльшчыкаў Лодзі

ВАРШАВА, 6. З Лодзі паведамляюць, што на канфэрэнцыі делегатаў шасьці рэфармісцкіх салозаў тэкстыльшчыкаў, якая адбылася ўчора, пад націскам рабочых мас была прынята рэзалюцыя **аб абвяшчэньні ўсеагульнай забастоўкі тэкстыльшчыкаў Лодзінскага раёну.** Рэзалюцыя выказвае патрабаваньне заключэньня новага калдагавору на ўмовах дагавору 1928 году, скарачэньня рабочага тыдню да 36 гадзін, скасаваньня новага закону аб рэарганізацыі сацыяльнай дапамогі. Як указваецца ў рэзалюцыі ўсеагульная забастоўка павінна пачацца сёньня.

КІТАЙЦЫ БУДУЮЦЬ АБАРОНЧЫЯ ПАЗЫЦЫІ УЗДОЎЖ ВЯЛІКАЙ СЬЦЯНЫ

ШАНХАЙ, 6. Паводле паведамленьня агенцтва «Рэйтэр» з Бэйпіну, **Чжан Сюэ-лян** атрымаў загад ад **Чан-Кайшы** аказваць супраціўленьне японцам і не прапускаць кітайскіх войск в **Жэхэ** на тэрыторыю Паўночнага Кітаю. Кітайскія войскі адыходзяць праз **Чахар і праходы Губэньконў і Сыфінкоў,** японская авіяцыя бамбардыруе адступаючыя часьці. Частка войск **Чжан Сюэ-ляна з Губэньконў** прасунулася на 20 міль у глыбіню **Жэхэ** і рыхтуецца да абароны. Месцазнаходжаньне **Тан Юй-ліна** невядома: па адных вестках ён забіт сваімі падуладнымі, па другіх, яго бачылі каля **Губэньконў.**

***

ШАНХАЙ, 7. Як падае агенцтва **«Юнайтэд-Прэс»** з Бэйпіну японскія войскі ўчора занялі **Губэньконў і Сіфынькоў** (праходы да Вялікай сьцяны і прасьледуюць кітайскія часьці на поўдні правінцыі Жэхэ).

Па словах агенцтва, кітайцы ствараюць абарончыя пазыцыі ўздоўж Вялікай сьцяны. **Чжан Сюэ-лян** стварае заслону паміж **Бэйпінам і Вялікай сьцяной.**

Агенцтва ўказвае, што ў правінцыі **Жэхэ** засталіся нібы толькі войскі **Тан Юй-ліна,** а рэшта вярнуліся ў правінцыю **Хабэй.** У Бэйпіне абвешчан стан аблогі. Па паведамленьнях агенцтва **«Рэйтэр»** часьці войск **Чжан Сюэ-ляна,** якія працягвалі аказваць супраціўленьне японцам у раёне **Лінь-юаня,** панесьлі вялікія страты. Японцы бамбардыруюць адступаючыя кітайскія войскі.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету

21-2 1933 году. гор. Менск.

Аб ходзе падрыхтоўкі прыгарадных саўгасаў да веснавой сяўбы

Адзначыць, што ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы па прыгарадных саўгасах праходзіць незадавальняючы.

а) Насенныя фонды на 15-II—1933 году створаны па абожжаных культурах топкі на 71,7 проц., па бульбе — на 84,2 проц., па травах — 42,2 проц. і гародным насеньні — 113,4 проц., што ставіць пад пагрозу зрыў выкананьня пляну пасеву;

б) рамонт трактараў праходзіць зусім дрэнна (з 12 адрамантаваных 3);

в) плян па вывазцы гною з гораду выканан на 36,4 проц.;

г) становішча з кармамі па часьці саўгасаў: «Новы сьвет», «Чырвоны маяк» і «Сапжанны» вельмі дрэннае, бранізваныя фуражныя фонды ў адзначаных саўгасах ня створаны і конская цягавая сіла знаходзіцца ў надзвычайна дрэнных умовах, у выніку частка коняй выведзена са строю.

Прэзыдыум гарасавету **пастанаўляе:**

1. Абавязаць начальніка сельгасэкстэрну. Белкавасаюзу тав. ШЛЕЙФЭРА ўпаўнаважанага па насеўкампаніі па прыгарадных саўгасах т. ШУЛЬКІНА і дырэктароў саўгасаў прыняць усе захады і на працягу адной дэкады (не позьней 5-III—1933 году) поўнасьцю забясьпечыць пляны ёлуўбы насеннымі матар'ялам (абожжавым, травы, гародзкае насеньне і раньняя бульба) конскую гаспадарку, згодна даведзенага да яе пляну. Гарэ даць рад практычных указаньняў саўгасам і калгасам аб паляпшэньні якасьці падрыхтоўкі і якасьці самой сяўбы.

2. Абавязаць тав. ШЛЕЙФЭРА і тав. ШУЛЬКІНА не позьней 5-III зрабіць перакідку насеньня з саўгасу ў саўгас, выявіўшы лішні і недахват па асобных культурах і кожнай гаспадарцы.

3. Даручыць дырэктарам саўгасаў не позьней 5-III—1933 г. закончыць рамонт трактараў і прычэпных сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару і, складзены акты аб якасьці рамонту, замацаваць машыны і асабліва трактары за трактарыстам, які будзе на іх працаваць. Тав. ШУЛЬКІНУ прасачыць ход рамонту і яго якасьць, а таксама забесьпячэньне запаснымі часткамі.

4. Абавязаць ГАРЗА (пад адказнасьць т. ЛЮЦЬКО), дырэктароў саўгасаў узмацніць працу па вывазцы гною і пошлу з гораду, мабілізаваўшы для гэтай мэты гарадзкі транспарт, згодна пастановы ЦК КП(б)В і СНК БССР, а таксама прыватных асоб, маючых конскую цягавую сілу, (ідучы ім заплаты), згодна вызначанай нормы. Сьпісы арганізацый і устаноў, якія да гэтага часу адмаўляюцца перадаваць гной для саўгасаў, перадаць пракурору. Тав. ШНІТКО за працягу адной дэкады закончыць сьледзтва і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

5. Даручыць дырэктарам саўгасаў не позьней 5-III стварыць бранізваныя фуражныя фонды (грубыя і канцэнтраваныя кармы) на час веснавой сяўбы, па норме, устаноўленай пастановай ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб падрыхтоўцы цягавай сілы да веснавой сяўбы. Абавязаць т. т. ШЛЕЙФЭРА, ШУЛЬКІНА, дырэктароў саўгасаў выкарыстаць сёньня шляхі на дастаўку ў гаспадаркі сена, загатоўленага імі ў іншых месцах («Загальле» і інш.).

6. Даручыць ГАРЗА т. ЯКУБОВІЧУ і дырэктарам саўгасаў на працягу 5 дзён правесьці аглядзіны конскага паголўя і ўсіх дулых і выведзеных са строю коняй, выкінуць у асобную групу, паставіць на падкорм для дальнейшага страчанай працаздольнасьці. Тав. ШНІТКО на працягу 5 дзён закончыць сьледзтва па саўгасах «Новы сьвет», «Чырвоны маяк» і «Сапжаны», дзе конская цягавая сіла прыведзена ў нягодзнасьць, і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

7. Абавязаць усе арганізацыі, жакты і райсоюзы часьці тэрміну ў 5-дзённы тэрмін надаць у гарэ планы пасеву займаемых імі земельных участкаў у гораде, гарэ прапрацаваць іх і ўнесьці на зацьвярджэньне чэргового пасяджэньня прэзыдыуму.

8. Прэзыдыум папярэджвае ўсіх дырэктароў саўгасаў, што за зрыў падрыхтоўкі веснавой сяўбы, несваўчасьне насеннага фонду, зрыў рамонту сельска-гаспадарчых машын, прыпад, інвэнтару, несваўчасьне бранізваных фуражных кармоў, непрымяненьне мер па лепшым захаваньні конскай цягавай сілы і за ўсякую маруднасьць і несвоечасовую падрыхтоўку — яны поўнасьцю нясуць адказнасьць і будуць прыцягвацца да адказнасьці.

9. Даручыць гарэ і бранізваўшаму па насеўкампаніі прыгарадных саўгасаў тав. ШУЛЬКІНУ не позьней 15-III правесьці агляд і праверку конскага саўгасу аб выкананьні гэтай пастановы і 19-III выніні дакладзіць прэзыдыуму Савету.

Старшыня Менгарсавету ВАЛОДЗЬКА. За сакратара ЯГОЎДЗІК.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПК ЦКК КП(б)В паведамляе, што 11 сакавіка ў Чырвонай Слабадзе, 14 сакавіка ў Копылі, 18 сакавіка ў Слуцку і 20 сакавіка ў Старых Дарогах будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)В па разгляду партсправаў Чырвона-Слабодзкага, Капыльскага, Слуцкага і Стара-Дароскага раёнаў.

Намі выклікаюцца наступныя т.т.:

На 11 сакавіка 1933 г. у Чырвоную Слабаду: Аоячук, Чадовіч, Радзюк А. А., Канановіч П. Я., Турлай А. Ф., Вайтовіч Ф., Пінчук А. Д.

На 14 у Копыль: Салановіч Р. П., Касінскі Я. Р., Букатаў І. І., Завін І. С., Самоцік В. Д., Ясючэня Ю. Т., Гофман Б. К., Дзеравянскі П. М.

На 18 сакавіка ў Слуцак: Жукоўскі Д. К., Непагодзін, Райхлін Л. М., Расамаха, Сідачоў М. А., Мяцельскі С. А., Бузьней І. С.

На 20 сакавіка ў Старыя-Дарогі: Малько Л., Гункін П. З., Мартынчук Д. І.

Яўка памянёных т.т. абавязкова. Неабходна прадставіць ПТ ЦКК характарыстыку партячэек аб апошняй работе.

Член ПК ЦКК КП(б)В СЬЦЯПЯК.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР БССР (БДТ-І.)

АНОНСІ Маст. кіраўн. Літвінаў

СЁНЬНЯ, ПРЭМ'ЕРА Л.П. Тур

ЗЯМЛЯ і НЕБА

п'еса ў 4-х дзеях.

Памяшканьне яўрэйскага дзяржаўнага тэатру ВАЛАДАРСКАЯ, 7.)

Сёньня і штодзенна гастролі ТЭА-ДЖАЗА Барыса Ромонага па зусім новай праграме

Гастролі Ніны Віктараўны Дульневіч.

Прымаюцца заявкі на калектыўныя паходы са значнай скідкай.

Штодзенна 2 выступленьні, Пачатак у 8 і 10 гадзін.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“

Сёньня і штодзенна

мастацкі фільм вытворч. Міжрабпомфільм

ЗЯМЛЯ У ПАЛОНЕ

Драма ў 6 частках

У гал. ролях: А. Стэн, А. Суданевіч, Е. Фогель, Н. Баталаў, М. Нароках.

Пачатак сэансаў ад 2 гадз. дня

Каса—з 12 гадз. дня.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня — Замежны мастацкі фільм ТРЫ ДЖЫГІ

„СПАРТАК“ Каса—ад 1 г. дня — мастацкі фільм САЛАМАНДРА драма ў 7 частках.

Менская гарадзкая камісія па справах б. чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан пры Менгарсавеце

даводзіць да ведама ўсіх чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан, што 9 сакавіка у 7 гдз. вечара, у Доме Чырвонай арміі АДБУДЗЕЦЦА

ЛЕКЦЫЯ

на тэму: «Што такое хэмія і паветраная абарона», а таксама „Сучасная ваенная тэхніка“.

Яўка ўсіх чырвоных партызан абавязкова.

КУРСЫ НАРМОЎШЧЫКАЎ

З 8-га па 11 сакавіка праводзіцца

ПРЫЁМ ЗАЯЎ

на 2-месячныя курсы нармоўшчыкаў пры Белдзэрнлугтрэсьце—гор. Менск, Савецкая, 57, ад 9 да 3 з палав. гадз.

Пажадана, каб паступаючыя мелі адукацыю ня менш 7-годкі.

Пры заяве павінна быць прыкладзена засьведчаная анкета па форме, устаноўленай для навучальных устаноў.

Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.

Лугтрэст.

СЁНЬНЯ, роўна ў 7 гадз. вечара,

у памяшканьні дому Камасьветы (былы клюб К. Маркса)

АДБУДЗЕЦЦА

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ

Менгаркому і ГКК КП(б)Б, Прэзыдыуму Менгарсавету і Гарпрафсавету,

прысьвечанае міжнароднаму камуністычнаму жаночаму дню.

ПАРАДАК ДНЯ:

Даклад аб міжнародным камуністычным жаночым дні.

Члены ЦК і ЦКК КП(б)Б, члены ЦВК і СНК СССР і БССР, члены ГК і ГКК КП(б)Б, члены ЦК і ГК ЛКСМБ, члены Гарсавету, члены ЦСПСБ і ГСПС праходзяць на пасяджэньне па сваіх мандатах. Усе астатнія праходзяць па спэцыяльных запрашальных білетах, якія павінны атрымаць сакратары п-к не позьней 7 сакавіка ў ГК КП(б)Б, пакой № 22.

Менгарком і ГКК КП(б)Б, Прэзыдыум Менгарсавету і Гарпрафсавету.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“.

АПОШНІЯ ДНІ

СЬПЯШЭЦЕ БАЧЫЦЬ

Лепшы гуковы мастацкі фільм

ПЕРШЫ УЗВОД

ШТОДЗЕННА 4 сэансы | ПАЧАТАК 5-30, 7-15, 9, 10-45.

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ

даводзіць да ведама ўсіх арганізацый і прадпрыемстваў, што

ВЫДАЧА ЗАРПЛАТЫ,

пачынаючы з першай паловы сакавіка, будзе праводзіцца ВЫКЛЮЧНА пры умовах прадстаўленьня СТАНДАРТНАЙ ДАВЕДКІ аб зьцьверджаным вышэйшай інстанцыяй фондзе зарплаты.

Стандартныя даведкі павінны спускацца прадпрыемствам і ўстановам адпаведнымі трэстамі ці аб'яднаньнямі у 2-х экземплярах (другі для філіялу банку).

Арганізацыі, якія знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэце. Стандартных даведак не прадстаўляюць. Бюджэтныя арганізацыі зарплата рэгулюецца ў межах спушчаных на зарплату крэдытаў (на адкрываемых для гэтага асобных рахунках)

Зарплата за студзень-люты выдаецца на аснове ўжо прадстаўленых арганізацыямі даведак (не стандартных).

Па ўсіх пытаньнях аб новым парадку рэгуляваньня і атрыманьня зарплаты адкрыта кансультацыя з 11 да 13 гадз. ў дзяржбанку, 4-ты паверх. пакой 9, тэл. № 22-766.

Усебелкантора Дзяржбанку.

Дзяржаўнаму Выдавецтву Беларуусі

ПАТРЭБНЫ

на сталую працу:

Стыльрэдактары,
Карэктары,
Старшы бухгальтар,
Бібліятэкар,
Машыністкі,
Тэхнічны сакратар.

Звараччэца—Савецкая, 59, канцылярыя выдавецтва.

Першы ў БССР дзіцячы гуковы кіно-тэатр.

Сёньня і штодзенна патрэсная праграма

1. Парад гліэараў (гуковы фільм)
2. Тэмпы рашаюць (гуковы фільм)
3. Заўжды гатовы (нямы дз. фільм).

ПАЧАТАК 1-га сэансу ў 11 г. раніцы. КАСА АДКРЫТА ў 10 гадз. раніцы.

Прымаюцца заяўкі на мэтавыя сэансы са скідкай 20 проц.

Беларускі Дзяржаўны Тэатр оперы і балету

абвяшчае НАБОР

у вакальна-музычны ансамбль (хор) тэатру.

Для залічэньня неабходна:

1. Наяўнасьць пэўнага голасу. 2. Веданьне нотнай граматы.

Проба галасоў праводзіцца да 10 сакавіка штодзенна з 1'да 2 гадз. дня і з 6 да 7 гадз. вечара ў будынку Польскага тэатру.

За ўсякімі даведкамі зварачацца ў канцылярыю тэатру.

Дырэкцыя БДТОБ.

Калектыў педагогаў і вучняў 4 і 20 ФЗВ выказваюць свой глыбокі жаль з прычыны сьмерці дарагога таварыша і любімага настаўніка

Сяргея Васільевіча АРЛОВА

Вынас цела з квартэры пакойнага на Н.-Каломенскім зав. д. № 7 у 3 гадзіны дня 8 сакавіка

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

17 лютага 1933 г. № 1 гор. Менск.

Правілы вулічнага руху па гораду Менску*)

Працяг разьдзелу III

Асэнізацыйны абоз

83. Да язды па гораду дапушчаюцца толькі бочкі, калымагі і пасуда, прызначаныя для ўдаленьня пачысьтот або сьмецьця, агледжаныя спэцыяльнай камісіяй і забясьпечаныя нумарам, прымацаваным да заднята дышла бочкі, калымагі і г. д. Выезд на работу з нясправнай, працякаючай і забрудзьненай бочкаю ці калымагамі забараняецца.

84. Пры сьледзеньні з нячыстотамі ці мусорам абозы павінны ехаць шагам і ня спыняцца.

Выключныя перавозкі

85. Перавозкі грузаў вялікай вагі, або непадзельных грузаў, перавышаючых максымальныя нормы па вазе і па размерах ці патрабуючыя запрэжкі больш з коняй, а таксама на ўсіх выпадках, калі транспартыроўка можа парушыць парадак і бясьпечнасьць вулічнага руху,—зьяўляецца выключнымі перавозкамі і патрабуюць асобнага дазволу кіраўніцтваў РС міліцыі.

Перавозка, узьнімаючых пыл матар'ялаў

86. Сьмецьце, будаўнічы сьцічы матар'ял і іншыя узьнімаючыя пыл матэрыі, якія перавозяцца бяз тары, павінны загрываацца брэзэнтам, рагожкамі ці іншым падшамерным пакрыватам.

Перавозка небясьпечных матэрый

87. Перавозка мінэральных кіслот, едкіх вадкасьцяй, якія лёгка загараюцца, і іншых шкодных матэрый, павінна рабіцца пры захаваньні наступных умоў:

а) скляжы павінны быць на рэсорах;

б) насуда павінна быць добра ўпакаванай, ня мець пачы і ня соўвацца пры штурхках;

в) калі ў час руху вадкасьць ці шкодная матэрыя пакідае на дарозе сьлед, вадзіцель павінен неадкладна спыніцца, папярэдзіць акружаючых аб небясьпечнасьці і пасьпець зараканае месца пяском ці іншым сьцічым матар'ялам. Адначасова ён абавязан даць знаць аб здарэньні ў блізкі міліцэйскі пост і да дазволу апошняга ня мае права ехаць далей.

Пры перавозцы матэрый, якія лёгка загараюцца, а таксама выбуховых матэрый, апрача паказанага вышэй парадку, належыць кіравацца спэцыяльнымі правіламі, якія ёсьць пасьпат гэтага.

Укладка грузу

88. Груз павінен быць размяркоўваны і замацаваны на транспарце такім чынам, каб ён пры руху ня мог соўнуцца, зваліцца, засьмецьць вуліцы і каб не рабіў шуму.

89. Забараняецца цягнуць груз па зямлі.

Разьдзел IV

Правілы язды на вэлёсыпэдах

90. Да язды на вэлёсыпэдах па гораду дапушчаюцца асобы, якія ўмеюць ездзіць, і не маладзей 15 год, атрымаўшыя нумарны знак.

Нумарны знак прымацоўваецца на заднім вілцы, не лябяючы вілкі.

91. На кожным вэлёсыпэдзе павінна быць тарэзкавае прыстасаваньне, звонок ці рэжковы сыгнал, а па наступленьні эмроку—запалены ліхтар.

92. Забараняецца:

а) язда на тратуарах і пешаходных дарожках паркаў і бульвараў;

б) язда з хуткасьцю звыш 12 клм. у гадзіну, язда ў перагонку, практыкаваньне і навучаньне на вуліцах, плошчах і іншых праездах;

в) язда ня трымаючыся за руль;

г) язда чапляючыся да экіпажаў трамвая, аўтамабіляў і экіпажаў;

д) язда на адпамесьцінных вэлёсыпэдах удваіх, а таксама з дзецьмі;

е) язда паміж трамвайных пуцей.

93. Пры групавой язьдзе вэлёсыпэдысты павінны ехаць адзін за адным, на адпаведнасьці ня менш 2 мэтраў адзін ад другога.

94. У мясцох вялікага натоўпу публікі і экіпажаў вэлёсыпэдыст павінен сыйсьці з вэлёсыпэду і весьці яго ў руках.

Разьдзел V

Рэйкавы транспарт (трамвай)

95. Да кіраваньня вагонамі трамваю дапушчаюцца асобы не маладзей 20 год, маючыя права на кіраваньне, зарэгістраванае ў органах РС міліцыі, і мець адпаведнае пасьведчаньне.

96. Вагонаважатаму забараняецца ў час руху:

а) размаўляць,

б) прымаць язду;

в) здымаць рукі з вялікай рукаяткі і кантралёра і паветранага тормаза.

Пры спусках і на перакрыжаваньнях вагонаважаты павінен працаваць абавязкова стоячы.

97. Не дапушчаюцца да руху вагоны праз:

а) з непрацуючымі тармазамі, пясочніцамі і алоўнымі сёткамі;

б) з непрацуючымі рэбартамі і дугамі;

в) з непрацуючымі ў кантралёры і ў адным з матораў;

г) пры адсутнасьці гукавых сыгналаў.

98. Вагонаважаты абавязан даваць загадзя ўстаноўленыя сыгналы:

а) перад пачаткам руху;

б) пры пераскочаньні вуліц;

в) на паваротах;

г) у мясцох вялікага натоўпу публікі;

д) трамвайным і транспарту, перасякаючым рэйкі трамваю.

99. Вагонаважаты абавязан сьціпіць ход вагона, ці спыніць яго:

а) пры пераходзе вайсковых часьцей строем, дэманстрацыяў і іншых урачыстых арганізаваных працэсій;

б) пры паваротах, закругленьнях, на спрэсках і пераскочаньнях лініі;

в) пры спуску з тары.

100. Пры пасадцы публікі ў вагоны трамваю кандуктар абавязан даваць сыгнал да руху толькі пасьля таго, як спыніцца ўваход і выход пасажыраў, пры вагоне, калі на падножках няма пасажыраў.

101. Вагонаважаты павінен спыняць вагон на патрабаваньні кандуктара, кантралёра, службовых асоб РС міліцыі, прычым спынены вагон не павінен загароджваць праходу ці праезду другому транспарту.

102. З насупраціўным цьмна і пры пустым гумане пярэднія ліхтары трамвайных вагонаў павінны быць запалены.

103. На астановках і пры вымушаных прастоях, вагонаважаты абавязан спыняць вагон так, каб не перашкаджаць папярэчнаму руху пешаходаў і транспарту.

104. Забараняецца прымацаўляцца да вагонаў трамваю, сісьці на падножках, увыходзіць і выходзіць з іх у часе руху вагонаў, выходзіць праз заднюю пляцоўку.

105. На пярэдняй пляцоўцы маторнага вагона трамваю дазваляецца праезд 2 работнікам РС міліцыі.

Разьдзел VI

Пешаходны рух

106. Пешаходны рух робіцца толькі па тратуарах (панэльных), перагрыжаваньнях, бульварах і спэцыяльных пераходах, адзначаных асобнымі знакамі (пакажчыкамі).

107. Пешаходы абавязаны:

а) пры руху на тратуарах трымацца правага боку ў напрамку руху;

б) ня спыняцца там, дзе гэта перашкаджае руху;

в) не жэмяцца ў групы, перашкаджаючыя руху;

г) пераходзіць на другі бок толькі на перакрыжаваньнях па прамой лініі, а не наўскасяк, на наступных вуліцах: Савецкай, Маскоўскай, Ленінскай, К. Маркса, Энгельса і Камунальнай і ў мясцох, адзначаных асобнымі пакажчыкамі, зьвяртаючы ўвагу на папярэджальныя знакі;

д) не гадзіць на бруку ўздоўж вуліцы;

е) пры перавозцы прамаўтных і забруджваючых прадметаў, а таксама пры сьледзеньні з пазёнкамі ці сапкамі (за выключэньнем дзіцячых калясак ці санак з дзецьмі) і з вялікымі мі—ісьці па бруку ўздоўж тратуару;

ж) пешаходы з сабакамі павінны весьці ці апошніх непасрэдна каля сябе на ўкарочанай прыязі.

108. Забараняецца:

а) наладжваньне ўсякіх гульняў на вуліцы, язда на качэлях, санках, лыжах, цялежках і г. д., а таксама перавозка непакрытых лістоў;

б) пакідаць на вуліцы дзяцей без нагляду, асабліва каля блізка праходзячых трамвайных пуцей;

в) домаўладальніцтвам загароджваць тратуары, за выключэньнем выпадкаў рамонту ці небясьпечнасьці абарваніць прыгожых ад небясьпекі; у гэтых выпадках павінны пасьцілацца шляхі з дошак, замяняючы тратуары.

Разьдзел VII

Вулічны гандаль

109. Вулічны гандаль з лярэяў, кіёскаў, а таксама ў дазвол і развоз робіцца ў адведзеных для гэтага мясцох.

110. Адвод месц пад гандаль робіцца гарсамасамі па ўгадненьні ў кожным паасобным выпадку з кіраўніцтвам РС міліцыі.

111. Забараняецца ўсякая самаўласная перастаноўка лавадуў і гандлёвых памяшканьняў, а таксама ў размеру займаемай плошчы.

112. Забараняецца гандляючым у разнос і ў развоз раскладваць свае тавары на бруку, тратуарах, пад'ездах, выступах дамоў і г. д.

Разьдзел VIII

Земляныя і іншыя работы і пабудовы на вуліцах і пераездах

113. Раскопваньне брукаў робіцца з дазволу Гарсамгасу.

114. Пабудова парасонаў над вагонамі жылых і гандлёвых памяшканьняў, а таксама ўстаноўка рэкламных шыльдаў, выходзячых на тратуары, дапушчаецца ня ніжэй 2-х мэтраў ад узроўню тратуару. Парасоны і шыльды павінны быць добра прымацаваны і не выступаць за край тратуару на вуліцу.

115. Усе рэкламныя ўстаноўкі і шыльды выдзяляюцца па ўгадненьні з кіраўніцтвам РС міліцыі.

116. Забараняецца на тратуарах і бруках:

а) складваньне грузу і тары пры нагрузцы ці разгрузцы грузавых экіпажаў;

б) пілка і колка дроў і да гэтага падобных дзеяньняў, якія разбураюць тратуары і перашкаджаюць вулічнаму руху.

Нам. Начальніка Галоўнага кіраўніцтва РС міліцыі пры СНК БССР ПЭДЭР.

16 лютага 1933 г.

*) КАНЕЦ. ПАЧАТАК ГЛ. У №№ 50 І 51, АД 5 І 8 САКАВІКА Г. Г.

Тэлефоны рэдакцыі: Адказны рэдактар—21-353; Адк. сакратар—21-354; сэктар сацзямляробства, мастацкага афармленьня —21-356; навочная рэдакцыя—21-357, транспартны, бюро расьсьледваньня рабселькораўскіх лістоў—21-355; партыйны, ваенна-палітычны—21-351; прамыслова-эканамічны, каапэрацыі і снабжэньня, культурны, унутранай інфармацыі—21-350 машыннае бюро—21-351; Заг. выдавецтва і кантора—21-885; -885; бухгальтэр